ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЧЭРВЕНЯ 2013 г. ЧАЦВЕР № 117 (27482) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Алена Ланская: «Мужчына павінен здзіўляць мяне кожны дзень. Яму давядзецца прыручаць «самотную ваўчыцу».

Карэспандэнт «Чырвонкі» паспрабавала «адматычыць» мільён у «Капітала». Журналіст уладкавалася на адзін дзень у дзіцячы лагер працы і адпачынку пад такой назвай. Атрымала ў рукі матыку і выйшла ў поле...

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ТОЗІК, намеснік прэм'ер-міністра:

«Асноўная работа па падрыхтоўцы да правядзення XXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» завершана. У Віцебску адбылося фактычна заключнае пасяджэнне аргкамітэта па падрыхтоўцы форуму, і, у адрозненне ад папярэдніх, яно было вельмі кароткім. Мы зрабілі яшчэ некалькі акцэнтаў. Усё, пра што дамаўляліся раней, Віцебскі аблвыканкам, гарвыканкам, дырэкцыя фестывалю зрабілі практычна ў поўным аб'ёме. Спадзяюся, што сёлета «Славянскі базар» набудзе новае аблічча, будзе больш дынамічным. Дарэчы, аб якасці падрыхтоўкі мерапрыемстваў можна меркаваць па прададзеных квітках. Па апошняй інфармацыі, іх ужо раскуплена каля 84%».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.06.2013 г.

Долар ЗША	8770,00	▲
Еўра	11460,00	▼
Рас. руб.	266,50	▼
Укр. грыўня	1077,33	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 19°
Віцебск	+ 23°
Гомель	+ 26°
Гродна	+ 20°
Магілёў	+ 25°
Мінск	+ 22°

ISSN 1990 - 763X

У ЧАКАННІ ПЧАЛІНЫХ РАЁЎ

Былыя аграномы Мікалай і Тамара Байкачовы з 1991 года займаюцца развядзеннем пчол, цяпер на сваім прысядзібным участку яны маюць ажно 40 меданосных сем'яў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ На слыху

НЕ ДАПУСЦІЦЬ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ

Як засцерагчыся ад афрыканскай чумы свіней?

21 чэрвеня на тэрыторыі вёскі Чапунь Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці зарэгістравана ўспышка афрыканскай чумы свіней, у сувязі з чым на тэрыторыі небяспечнага пункта і пагражальных зон устаноўлены каранцін і ўведзены шэраг абмежавальных мер. Цяпер праводзяцца мерапрыемствы па ліквідацыі ачага захворвання і недапушчэнні распаўсюджвання апошняга.

Умовы каранціну прадугледжваюць пэўны парадак ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці, перамяшчэння транспарту і насельніцтва на гэтай тэрыторыі. Насельніцтва будзе інфармавацца аб гэтым парадку праз мясцовыя сродкі масавай інфармацыі, прадстаўнікоў сельскіх выканаўчых камітэтаў і спецыялістаў дзяржаўнай ветэрынарнай службы пры падворных абходах.

Спецыялістамі выяўлена, што прычынай успышкі з'явілася выкарыстанне ў корм хворай свінні камбікорму, заражанага ўзбуджальнікам афрыканскай чумы свіней. Менавіта таму дзяржаўная ветэрынарная служба звяртаецца да насельніцтва з просьбай звярнуць асаблівую ўвагу на ўтрыманне і кармленне свіней на сваіх асабістых падворках. Усе кармы неабходна набываць выключна ў гандлёвай сетцы Белкаапсаюза або непасрэдна ў фірменных гандлёвых сетках арганізацый камбікормавай прамысловасці рэспублікі. Рэкамендуецца не набываць кармы, якія развозяцца па населеных пунктах індывідуальнымі прадпрымальнікамі і фізічнымі асобамі.

У абавязковым парадку неабходна адсочваць наяўнасць маркіроўкі на ўпакоўцы кармоў і не прымяняць для кармлення свіней ужо набытыя кармы, упакоўка якіх не мае адпаведных этыкетак.

СТАР. 3

■ Парламенцкі дзённік

КАНЦЭСІІ, ІНВЕСТЫЦЫІ, МЕДЫЯЦЫЯ...

Дэпутаты прынялі законы, якія ўвядуць нязвыклыя словы ў шырокі ўжытак

І гэта будзе азначаць, што ў нечым жыццё беларусаў павінна значна памяняцца. Новыя словы цягнуць за сабой новыя з'явы. Хоць у сферы заканатворчасці гэта не зусім так. Звычайна закон з'яўляецца, каб урэгуляваць тое, што ўжо мае месца, даць пэўнай з'яве магчымасць развівацца ў прававым полі. Але гэта якраз і азначае пераўтварэнне нечага экзатычнага і нязвыклага ў звычайнае, штодзённае. Учора на пасяджэнні сесіі Палаты прадстаўнікоў восем законапраектаў былі прыняты ў другім чытанні, з іх чатыры — цалкам новыя.

Еўрапейская каляіна для бухгалтэрыі

Законапраект «Аб бухгалтарскім уліку і справаздачнасці» — адзін з такіх. У яго назве няма нязвыклых для нашага вуха слоў, аднак сам закон пераводзіць добрую старую бухгалтарскую справу на цалкам новыя, сучасныя рэйкі.

— Праект закона распрацаваны ў выкананне плана мерапрыемстваў па набліжэнні нацыянальнага заканадаўства з міжнароднымі стандартамі фінансавай справаздачнасці, — прадставіла законапраект **старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Людміла ДАБРЫНІНА**. — З мэтай адаптацыі нацыянальнай справаздачнай сістэмы да агульнасусветных тэндэнцый глабалізацыі эканомікі.

СТАР 2

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

28 чэрвеня 2013 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца **заключнае пасяджэнне другой сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання**.

«ПРАМАЯ ЛІНІЯ» З МІНІСТРАМ ЖКГ

У пятніцу 28 чэрвеня з 11.00 да 12.00 у рэдакцыі газеты «Звязда» пройдзе «прамая лінія» з **міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэем Віктаравічам ШОРЦАМ**.

Ці будуць сёлета расці тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі? Якія віды работ пры капрамонце павінны аплачваць самі жыльцы? Калі ў жыроўцы з'явіцца графа, якая будзе «расшыфроўваць» тэхпаслугі? Колькі будзе каштаваць арэнднае жыллё? На гэтыя і іншыя пытанні адкажа наш суразмоўца.

Тэлефануйце па нумарах **(8-017) 287 18 66 і (8-017) 287 18 71.**

Папярэднія пытанні можна задаваць па тэлефонах **(8-017) 287 18 29 і (8-017) 287 18 69.**

КАНЦЭСІІ, ІНВЕСТЫЦЫІ, МЕДЫЯЦЫЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У дакументе, у прыватнасці, сказана, што грамадска значныя арганізацыі, гэта значыць, банкі і нябанкаўскія крэдытна-фінансавыя арганізацыі, а таксама ААТ (якія з'яўляюцца заснавальнікамі ўнітарных прадпрыемстваў і (або) асноўнымі гаспадарчымі таварыствамі ў адносінах да даччыных гаспадарчых таварыстваў) і страхавыя арганізацыі, будуць абавязаны складаць кансалідаваную справаздачнасць у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі фінансавай справаздачнасці (МСФС). Парадак увядзення ў дзеянне МСФС у Беларусі будзе вызначаць Савет Міністраў і Нацыянальны банк.

Таксама ў праекце закона гаворыцца аб нацыянальнай сертыфікацыі спецыялістаў, якія прэтэндуюць на пасады галоўных бухгалтараў у грамадска значных арганізацыях. Сертыфікат прафесійнага бухгалтара будзе выдаваць Мінфін, а сертыфікат прафесійнага бухгалтара банка — Нацбанк.

Абарона для інвестараў

Да слова «інвестыцыі» вуха сярэднестатыстычнага беларуса паспела прывыкнуць, аднак пакуль што яно часцей гучыць абстрактна — з вуснаў высокапастаўленых чыноўнікаў ды дыктараў. Для таго, каб укладаць грошы ў беларускую эканоміку было цікава, і быў распрацаваны праект новага закона.

— Законапраект з'яўляецца важным этапам істотнага абнаўлення інвестыцыйнага заканадаўства нашай краіны, — сказаў **старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Уладзімір КРАЎЦОЎ**. — Законапраект накіраваны на ўсталяванне прававых падстаў і асноўных прынцыпаў ажыццяўлення інвестыцый на тэрыторыі Беларусі, прыцягненне інвестыцый у эканоміку краіны, забеспячэнне правоў і гарантый інвестараў, а таксама іх роўнай абароне. Падчас падрыхтоўкі законапраекта ў Палату прадстаўнікоў паступіла больш за 200 пісьмовых заўваг і прапаноў, у тым ліку з боку Міжнароднай фінансавай карпарацыі і шэрагу грамадскіх аб'яднанняў Беларусі. Усе заўвагі былі прапрацаваныя рабочай групай. Пры гэтым улічваліся вынікі аналізу нормаў інвестыцыйнага заканадаўства Беларусі і іншых дзяржаў, рэкамендацыі міжнародных экспертаў Міжнароднай фінансавай карпарацыі (Венскі офіс), а таксама членаў рабочай групы па ўдасканаленні інвестыцыйнага заканадаўства пры кансультатыўным савеце па замежных інвестыцыях пры Савеце Міністраў Беларусі.

У прыватнасці, законапраект быў дапрацаваны ў частцы тэрміналогіі, удакладнены паняцці «інвестыцыі» і «інвестар». У праекце закона прадугледжваецца, што да інвестыцый адносяцца толькі маёмасць і іншыя аб'екты грамадзянскіх правоў, якія выкарыстоўваюцца інвестарам для мэт, якія не звязаны з асабістым, сямейным, дамашнім і іншым выкарыстаннем.

Суб'ектны склад паняцця «інвестар» прыведзены ў адпаведнасць з грамадзянскім заканадаўствам Беларусі. Удакладнена сфера дзейнасці закона. Пры гэтым замацоўваецца, што яго дзеянне распаўсюджваецца на адносіны, звязаныя з ажыццяўленнем інвестыцый на тэрыторыі Беларусі, за выключэннем укладання маёмасці ў некамерцыйныя арганізацыі, у дачыненні да маёмасці якіх іх заснавальнікі не маюць права ўласнасці або іншых рэчавых правоў, набыцця каштоўных папер, акрамя акцый, набыцця або будаўніцтва грамадзянамі Беларусі, замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства жылых дамоў, жылых памяшканняў для пражывання гэтых грамадзян, асоб без грамадзянства і членаў іх сем'яў, прадастаўлення пазык, крэдытаў і іх вяртання, размяшчэння банкаўскіх укладаў.

Законапраект дапоўнены раздзелам, які вызначае дзяржаўнае рэгуляванне, якое замацоўвае кампетэнцыю Прэзідэнта, Савета Міністраў, іншых дзяржаўных органаў і іншых дзяржарганізацый у сферы інвестыцый.

Давер прыватніку

З законам аб інвестыцыях цесна звязаны і Закон «Аб канцэсіях», які таксама распрацаваны ў Беларусі ўпершыню.

Канцэсія, канцэсійная дамова — форма дзяржаўна-прыватнага партнёрства, уцягванне прыватнага сектара ў эфектыўнае кіраванне дзяржаўнай уласнасцю ці ў аказанне паслуг, якія звычайна аказваюцца дзяржавай, на ўзаемавыгадных умовах. Канцэсія мае на ўвазе, што канцэдэнт (дзяржава) перадае канцэсіянеру права на эксплуатацыю прыродных рэсурсаў, аб'ектаў інфраструктуры, прадпрыемстваў, абсталяванне, а ўзамен атрымлівае ўзнагароду ў выглядзе разавых ці перыядычных (роялці) плацяжоў.

Пасля першага чытання рэдакцыя законапраекта, у выніку ўнесеных змен, была абноўлена. У дакументе, у прыватнасці, адзначана, што канцэсіянерамі не могуць выступаць дзяржаўныя юрыдычныя асобы. Аб'ектамі канцэсіі могуць быць: нетры, воды і лясы, якія, згодна з Канстытуцыяй, з'яўляюцца выключнай дзяржуласнасцю; віды дзейнасці, на ажыццяўленне якіх распаўсюджваецца выключнае права дзяржавы; аб'екты, якія знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы.

Слухаць і чуць

Распрацоўшчыкі законапраекта «Аб медыяцыі» спадзяюцца на тое, што новы від вырашэння спрэчак зробіць беларусаў больш інтэлігентнымі.

— Медыяцыя — гэта перамовы бакоў з удзелам медыятара (пасрэдніка) з мэтай урэгулявання спрэчкі шляхам выпрацоўкі ўзаемапрымальных пагадненняў, — пракаментавала закон **дэпутат Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Наталля ГУЙВІК**. — Інстытут медыяцыі развіты вельмі даўно — з сярэдзіны мінулага стагоддзя — у ЗША, Японіі, Кітаі, краінах ЕС. У 2010 годзе такі закон быў прыняты ў Казахстане, у 2011 годзе — у Расіі. Сёння такі законапраект прыняты ў Беларусі.

Прымяненне медыяцыі ў нашай краіне пашырыць магчымасці для грамадзян і суб'ектаў гаспадарання ў выбары метадаў урэгулявання спрэчак і канфліктаў. Таксама інстытут медыяцыі дазволіць знізіць нагрузку дзяржаўнага правасуддзя. Ён дазволіць сэканоміць працэсуальныя выдаткі грамадзян. «Але галоўнае, у нашым грамадстве нарэшце навучацца не толькі слухаць, але і чуць», — падкрэсліла дэпутат.

Новы закон для сучаснага гандлю

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў прынялі ў першым чытанні праект закона аб дзяржрэгуляванні гандлю і грамадскага харчавання. І хаця сфера гандлю старая, як гэты свет, аднак новыя формы яго (такія, як інтэрнэт-гандаль, сеткавы гандаль, гіпермаркеты і інш.) даўно ўжо сталі для нас звыклымі. Цяпер дзяржава замацоўвае правілы для новых гульцоў.

Адно з палажэнняў законапраекта замацоўвае гранічныя значэнні долі суб'екта гандлю ў тавараабароце. Пасля яго дасягнення суб'ект не будзе мець права набываць або арандаваць дадатковую гандлёвую плошчу ў пэўных адміністрацыйна-тэрытарыяльных межах. Праект закона гаворыць, што такая мяжа — 20 працэнтаў. Методыка разліку такіх доляў у аб'ёме рознічнага тавараабароту будзе вызначацца Саўмінам.

Адказваючы на пытанні дэпутатаў, **намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ** адзначыла, што квота 20 працэнтаў датычыцца менавіта гандлю харчовымі таварамі. Яна падкрэсліла, што такое рэгуляванне ёсць у многіх краінах, паколькі гэта забеспячэнне харчовай бяспекі. Манапаліст можа завезці няякасны прадукт або павысіць цану, а квота — гэта своеасаблівы бар'ер, які мінімізуе падобныя рызыкі. Пры гэтым намеснік міністра звярнула ўвагу, што тыя сеткі, якія занялі цяпер у некаторых рэгіёнах больш за 20 працэнтаў, пасля ўступлення закона ў сілу не страцяць гандлёвыя плошчы: «Норма закона будзе прымяняцца на адносіны, якія ўзніклі пасля яго ўступлення ў сілу».

— Паколькі гандаль выконвае важныя эканамічныя і сацыяльныя функцыі, падтрымлівае высокі ўзровень жыцця насельніцтва, занятасці, развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё дзяржавы, праект закона надзвычай важны для грамадства, — лічыць **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Аляксей КУЗЬМІЧ**. — Яго прыняцце з'яўляецца своечасовым, бо на спажывецкім рынку краіны адбываюцца змены, выкліканыя прымяненнем перадавых тэхналогій, выкарыстаннем сучасных метадаў кіравання, якія забяспечваюць павышэнне эфектыўнасці працы гандлёвых арганізацый.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

АСНОЎНАЯ ПРАБЛЕМА — САМАЎПРАЎСТВА

Ва ўсе часы існуюць людзі, якія жывуць па прынцыпе «што хачу — тое і раблю», не зважаючы пры гэтым ні на што. У тым ліку і на «літару закона». І часам самавольшчыкі пачынаюць выпраўляцца толькі перад праверкамі ці пасля выпісаных ім буйных штрафаў. Але наколькі востра зараз стаіць у Мінскай вобласці гэтая праблема?

— Не сакрэт, што ў бюджэтах раёнаў часам не хапае грошай для паўнавартаснай аховы, маштабнай рэканструкцыі і аднаўленчых работ на аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны. Але ж падтрыманне элементарнага парадку вялікіх выдаткаў не пацягне! Тым не менш пракуратура рэгулярна высвятляе, што дзе-нідзе да помнікаў архітэктуры адносяцца на месцах неахайна. Так, будынкі і прылеглыя да іх тэрыторыі зарастаюць травой, фактычна ператвараюцца ў звалку... Гэтыя недахопы былі выяўлены на тэрыторыі Капыльскага, Слуцкага, Мінскага, Валожынскага, Пухавіцкага і Бярэзінскага раёнаў, — канстатуе сітуацыю **пракурор Мінскай вобласці, старшы саветнік юстыцыі Алег ЛАЎРУХІН**. — У такім выпадку пракуратура складае акт надзору, дзе чорным па белым прапісаны неабходныя меры для выпраўлення сітуацыі. А вінаватыя службовыя асобы адказваюць за свае пралікі. Больш за тое, мы цалкам падтрымліваем прапанову Міністэрства культуры аб тым, што мясцовыя органы ўлады павінны хаця б кансерваваць такія праблемныя аб'екты.

У Мінскім раёне на зямлю прэтэндуе больш за 21 тысячу чалавек. Але надзелаў зараз не хапае нават на адзін працэнт ад іх колькасці.

А вось праблема так званых «чорных капальнікаў» на Міншчыне так востра ўжо не стаіць. Летась у вобласці ўвогуле не зарэгістравана выпадкаў нелегальных раскопак у пошуку каштоўнасцяў.

Аднак самавольства, на жаль, не знікла з прыродаахоўнай галіны. Тут часам справа даходзіць да непрыкрытага парушэння заканадаўства. Напрыклад, у Чэрвеньскім і Лагойскім раёнах некаторыя прадпрыемствы самавольна распрацоўвалі кар'еры. У Маладзечанскім раёне ад несанкцыянаванай дзейнасці па ўтылізацыі адходаў нафтаперапрацоўкі аказалася забруджанай рака Уша. Не адышла на другі план і хранічная праблема несанкцыянаваных звалак... І таму раённыя пракуроры будуць цяпер праводзіць праверкі не радзей, чым адзін раз у шэсць месяцаў.

Трапляюць у поле зроку супрацоўнікаў пракуратуры і выпадкі самавольства ў зямельнай сферы. Людзі проста захопліваюць зямельныя ўчасткі або пападаюцца на іх нямэтавым выкарыстанні. Бывае і так, што яны іх атрымліваюць з парушэннямі законаў. Асабліва гэта датычыцца прылеглых да сталіцы тэрыторый — усё-такі меркантыльнасць ніхто не адмяняў. Ажыятажны попыт на зямлю паблізу мегаполіса прывёў да яе вострага дэфіцыту. Так, зараз на Міншчыне ў чарзе на ўчасткі стаяць 32 тысячы чалавек. З іх 70% прэтэндуюць на зямлю непасрэдна ў прысталічы. Прытым вольных надзелаў у раёне ўсяго налічваецца толькі 196, а доўгачаканыя «соткі» атрымалі ўсяго 155 чалавек...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

■ На кантролі

НЯПЭЎНАЯ ВЫГАДА

КДК Гродзенскай вобласці накіраваў у праваахоўныя органы матэрыялы праверкі прыватнага прадпрыемства «Эфатон». У кантралёраў узніклі пытанні да вынікаў тэндару, які праводзіўся гэтым прадпрыемствам па вырабе станка для вытворчасці кручаных абечкаў з металічнай сеткі. На разгляд тэндарнай камісіі паступілі прапановы ад пяці ўдзельнікаў, сярод якіх найбольш выгаднай прызналі прапанову таварыства з абмежаванай адказнасцю «Спектр-СТ» (Расія). Аднак, на думку правяраючых, яе трэба было адхіліць: прапаноўваўся станок, які ўжо быў ва ўжытку і не прадугледжваўся тэхнічным заданнем. Такім чынам, не забяспечана выкарыстанне сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны (450 мільёнаў рублёў) згодна з заканадаўствам і працэдурай закупак.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Да ведама

МІНГАРСАВЕТ ЗАХАВАЎ НАЗВУ МКАД

Мінгарсавет захаваў назву МКАД і даў назву новаму мікрараёну сталіцы — Магістр. Такое рашэнне прынята ўчора на 24-й сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, перадае БЕЛТА.

Як адзначыла начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Віталіна Рудзікава, пастановай Савета Міністраў аўтамабільная дарога М-9 вакол Мінска была перададзена ў камунальную ўласнасць са статусам магістральнай вуліцы бесперапыннага руху. Цяпер гэта элемент вулічнай сеткі. Камісія разгледзела розныя прапановы назвы гэтай дарогі і вырашыла захаваць ранейшую, усім прывычную. Такім чынам, МКАД атрымлівае назву вуліца Мінская кальцавая аўтамабільная дарога.

Праектуемы раён у межах вул. Незалежнасці, МКАД, вул. Францыска Скарыны, праезду перад лесапаркавай зонай будзе называца мікрараён Магістр. Тут будуць пабудаваны дамы для навуковай і творчай інтэлігенцыі.

З улікам меркавання гараджан праектуемая вуліца нумар 1 у межах вул. Вяснінка, завулка Вяснінка, праспекта Пераможцаў названа вуліцай Вербная, а праектуемая вуліца нумар 1 у межах вул. Мікалаеўская, вул. Зацень — вуліцай Калядная. «Гэтыя вуліцы з'явяцца ў вельмі прыгожым раёне сталіцы, іх назва не супярэчыць ужо існуючым назвам вуліц, мілагучная на рускай і беларускай мовах», — сказала Віталіна Рудзікава.

Участак аўтамабільнай аўтадарогі М-4 Мінск—Магілёў (прадаўжэнне Партызанскага праспекта) працягласцю амаль 3,9 км атрымаў назву Смілавіцкі тракт. Паводле слоў Віталіны Рудзікавай, традыцыйна склалася, што вуліцы на выездах з Мінска называюць трактамі (напрыклад, Лагойскі, Ігуменскі, Даўгінаўскі).

■ Спёка!

ГАРАДСКІЯ «ААЗІСЫ»: РАТУЕМСЯ АД СМАГІ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Часам у гарачае надвор'е перамяшчэнне па горадзе нагадвае павольнае перасоўванне па распаленай сонцам пустыні: пясок (у нашым выпадку — асфальт) нагрэты ледзьве не да чырвані, хада запаволена, а ў галаве думкі толькі пра магчымасць хутчэй наталіць смагу і схавацца ў прахалодзе. Карэспандэнт «Звязды» ў самую спёку прагулялася па сталіцы і высветліла, дзе і як можна выратавацца ад гарачыні нечым халодненькім. Для «эксперыменту» мы абралі тры месцы: цэнтр сталіцы, некалькі вуліц звычайнага «спальнага» раёна, а таксама адзін з гарадскіх пляжаў.

«Цэнтральныя» далікатэсы

...«Прагуляцца па горадзе і не памерці ад смагі» — кароткая акрэсліла для сябе задачу і рушыла ў дарогу. Якое «памерці ад смагі», спытаюцца чытачы, улічваючы, што размова ідзе пра вялікі горад, дзе напоўкі і марозіва прадаюцца на кожным кроку. Але трэба адразу ўзгадаць, што шукаць мы пайшлі не звычайныя прадуктовыя крамы, дзе вышэйзгаданага дабра поўна хоць зімой, хоць летам, а менавіта «прыкметы» цёплага сезона — латкі з марозівам і напоўкамі на вуліцах.

Перш наперш вырашана было прагуляцца дзе-небудзь у цэнтры Мінска. Чаму б, напрыклад, не прайсціся ад вуліцы Карла Маркса да Нямігі? Сказана — зроблена! У самым пачатку маршруту я намагалася ўдалечыні разгледзець хоць бы якую бочку з квасам. Позірк нічога не радавала, ды і жоўтая пузатая канструкцыя, відаць, не ўпісалася б у «інтэр'ер» гэтай вуліцы, якую паступова «прывучаюць» да статусу пешаходнай. Так што квасу няма. Затое поўна розных кавярняў і летнія тэрасы на тратуары — пры іх. Бліжэйшае знаёмства з меню некалькіх кавярняў на Карла Маркса дало зразумець: калі раптам смага застане падчас прагулкі, то проста «папіць вады» будзе каштаваць ад 7 да 10 тысяч (менавіта столькі давядзецца аддаць за паўлітровую бутэльку ахалоджанай вады без газу). Адначасова смачным і прахалодным варыянтам можа стаць малочны кактэйль: гэта «пацягне» з кішэні змучанага спёкай ад 24 да 32 тысяч рублёў. У адной з кавярняў удалося знайсці малочны кактэйль з клубніцамі за 18 тысяч, але там падаюць 150 грамаў напою, у той час як менш бюджэтныя варыянты маюць 200 грамаў «халоднага шчасця». На свежавыціснуты сок прыйдзецца выдаткаваць 24 — 26 тысяч, а марозіва ў кавярнях каштуе ад 18 тысяч рублёў за порцыю.

У прынцыпе, выбар неблагі, нават не простыя вада і марозіва, а ў нейкім сэнсе, «далікатэснае халоднае меню». Але раптам чалавек жадае прахалоды, але не хоча сядзець у кавярні? Ужо не чакаючы сустрэць на Карла Маркса ніякага спосабу астудзіцца, акрамя спажывання халодных напояў на летніх тэрасах, я натрапіла на латок, з якога прадавалі марозіва на развес. Порцыя памерам у адзін шарык плюс вафельны ражок абышлася ў 9 тысяч рублёў.

Далей чакаў выхад на праспект і шпацыр па цяністай ліпавай алеі. Наступнай «крыніцай прахалоды» пасля латка з марозівам стаў вядомы рэстаран хуткага харчавання. Але там трэба было адстаяць немалую чаргу, таму такі варыянт быў адкінуты. Наўрад ці таму, хто вельмі хоча выратавацца ад спёкі, захочацца столькі чакаць. Наступныя пункты на шляху — французскі і японскі рэстараны. Толькі ж тут ужо без летніх тэрас, таму ў разрад «хуткая прахалодная дапамога на вуліцы» яны таксама не трапляюць. Халодны эфект ад з'едзенага марозіва пачаў слабець, а на маім шляху неяк не траплялася пакуль месца, дзе б яго «папоўніць». На плошчы Свабоды заўважаю кіёскі, але яны аказваюцца месцам продажу сувеніраў. Зразумела, у такім бойкім турыстычным месцы не абысціся без кавярняў. У прынцыпе, «халодны набор» той жа: марозіва, кактэйлі, вада. І цэны падобныя. Думаю, самы час пераходзіць да наступнага аб'екта...

«Раённая» прахалода

...Стары спальны раён сталіцы, вуліца Каліноўскага. У будны дзень сустракаю на ёй пераважна пенсіянераў і мам з каляскамі, ну і яшчэ школьнікаў, якія не раз'ехаліся на летніках і вёсках. Спачатку ад спёкі ратуе цяністая вуліца, паўз якую растуць вялікія каштаны, але ж шукаць патрэбна зусім не гэта. Першыя метраў пяцьсот поўнасцю расчароўваюць: спачатку шлях ідзе толькі міма жылых дамоў (з акна табе наўрад ці хто шкляначку вады падасць), пасля — аптэка, мэблева крама, безліч заездаў у дворы і выездаў з іх. Па другі бок вуліцы — увогуле «дзікаваты» сквер без усялякага намёку нават на маленькі кіёск, дзе прадаецца хоць нешта пітное і халоднае. Нават прадуктовая крама, да якой я дайшла хвілін праз дзесяць, аказалася закрытай на рамонт. Тут паціху стала прыходзіць разуменне, што, відаць, па такіх месцах гуляць у спёку патрэбна толькі з загадзя нарыхтаванай бутэлечкай халоднай вады ў сумцы. Але ж (о шчасце!) мае страхі аказаліся беспадстаўнымі. Нарэшце за аўтобусным прыпынкам я ўбачыла «прыкметы цывілізацыі» ў выглядзе працуючай прадуктовай крамы і бочкі з квасам. Пакуль стаяла ў чарзе, паспела вывучыць цэны. Невялічкая шклянка, у якую змяшчаецца крыху больш за 300 грамаў квасу, каштуе 2,5 тысячы рублёў. Паўтаралітровая бутэлька абыдзецца ў 15 тысяч рублёў, а тры літры квасу можна набыць за 25 тысяч рублёў. Што ж, варта «вывучаць тэрыторыю» далей. Пасля раскошных летніх тэрас на Карла Маркса сапраўднай экзотыкай падаўся мясцовы кафетэрый. За адным са столікаў сядзеў мужчына і «шукаў прахалоду» ў піве, якое заядаў смажанкай. Мяне ж цікавіла «летняе меню», у якім я знайшла малочны кактэйль, 150 грамаў якога каштавала крыху больш за 4 тысячы рублёў, а таксама марозіва ў асартыменце (як пішуць у меню, з «драблёнымі клубніцамі, малінай ці арэхамі») коштам ад 7 да 10 тысяч рублёў.

Ужо збіраючыся пайсці, я заўважыла за рагом яшчэ адну бочку з квасам. Паколькі канкурэнцыя — справа сур'ёзная, уласнікі гэтай бочкі прадаюць свой квас крыху танней. Так, «трохсотграмовую» шклянку квасу можна выпіць, заплаціўшы 2,3 тысячы рублёў, а паўтара і тры літры напою можна набыць за 11,5 і 23 тысячы адпаведна. Пасля такой «канцэнтрацыі прахалоды» самы час — на пляж...

Вас іст дас? «Пляжны» квас!

...На беразе Цнянскага вадасховішча шматлюдна, нягледзячы на будны дзень. Сярод аматараў сонечных ваннаў няма «бледнатварых», усе ўжо з загарам. Значыць, пастаянная публіка. Я прыгадала, што, калі ісці на пляж ад аўтобуснага прыпынку, можна пабачыць вялікую краму і запасціся пітвом і марозівам там. Мяркуючы па бутэльках мінералкі побач з месцамі, дзе людзі размяшчаюцца для адпачынку, усё так і ёсць. Абачліваю наведвальнікі пляжу ў курсе: да самага вадасховішча не сустрэнеш больш ніякага спосабу выратавацца ад спёкі. Ісці, вядома, не дзесяць кіламетраў, але ўсё ж...

На самім пляжы заўважаю «квасную» бочку, падыходжу бліжэй і са здзіўленнем разумею, што «працоўны дзень» у бочкі скончаны. Побач — ні прадаўца, ні, зразумела, хоць якой пазнакі пра кошты. А народу на пляжы процьма, нягледзячы на тое, што на гадзінніку — каля васьмі вечара. Шчасце, што побач знайшлася калонка з пітной вадой, якую можна хлёбаць абсалютна бясплатна. Эх, не запаслася я пітвом ці марозівам, калі праходзіла міма крамы! Але ж тут позірк падае на пагорачак, на якім віднеюцца вялікія жоўтыя парасоны і столікі. Загадкавае скапленне вышэйзгаданага інвентару аказалася пляжнай «кафэшкай» (кавярняй гэта назваць цяжка). Досыць «атмасфернае» месца, дзе наведвальнікі п'юць піва ў шортах і з голым торсам. Але, мяркуючы па прылаўку, тут прадаецца і разліўны квас. Вось і кошт напісаны — 8 тысяч за паўлітра. Замаўляю сабе шкляначку.

— Хвіліначку! Толькі калі гэта атрымаецца...

Што значыць — атрымаецца? А прадавец тым часам з усяе сілы цісне на кранік, і ў шклянку сіратліва падаюць пару кропель квасу і шмат пены. На гэтым усё! Не атрымалася. Вось які ён «каварны», пляжны квас.

Павывучаўшы яшчэ крыху цэннікі ў «кафэшцы», знайшла там пітную ваду коштам 10 тысяч за літр, а таксама — безліч гатункаў піва і шашлык. Але гэта ўжо да тэмы ніякага дачынення не мае.

Вяртаючыся з пляжу, я ўсё ж такі збочыла да крамы, дзе набыла літровую бутэльку разліўнога квасу за 15 тысяч рублёў, каб крыху кампенсаваць няўдачу ў сваіх «пляжных» пошуках прахалоды. Што ні кажы, запас — вялікая справа.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■

ВАДА І БЯДА

Цяжка знайсці чалавека, які б не ратаваўся ад летняй спякоты каля рэчак ці азёраў. Аднак штогод у беларускіх вадаёмах смерць знаходзяць сотні людзей. Прычыны, па якіх купальшчыкі ідуць на дно, самыя розныя. Адзін палез у ваду, спажыўшы перад тым напой з градусамі. Другі не разлічыў свае сілы. Трэці купаўся ў зоне, якая не ахоўваецца... Ужо сёлета вада забрала жыцці 222 чалавек, у тым ліку 20 дзіцячых. А на падыходзе ліпень — традыцыйна самы гарачы месяц для выратавальнікаў на вадзе.

— Толькі за мінулы тыдзень нашы спецыялісты ўратавалі жыцці 53 чалавекам. Аднак з вадаёмаў дадому не вярнуліся 40 чалавек. І што самае страшнае, пяцярым з іх не споўнілася васямнаццаці гадоў. Значыць, за імі не дагледзелі бацькі, не навучылі плаваць у школе. Чатыры з пяці тапельцаў — гэта мужчыны, — аналізуе сітуацыю старшыня Беларускага рэспубліканскага таварыства ратавання на водах Анвар Ігамбердыеў. — Ёсць сярод іх і «рэкардсмены». Так, у крыві аднаго з загінулых купальшчыкаў было 8,2 праміле алкаголю, і гэта пры тым, што смяротная доза ніжэйшая амаль у два разы... Безадказна паводзяць сябе на вадзе і цвярозыя. Літаральна ўчора мы ездзілі ў рэйд і бачылі, як людзі заплываюць на сярэдзіну вадасховішча на бярвеннях, дошках, пенапласце, матрацах, бяруць з сабой сабак... Але не задумваюцца аб тым, што ўсяго адзін неасцярожны рух можа прывесці да таго, што ў ваду трапяць усе. А калі бліжэйшы выратавальны пост знаходзіцца за 3-5 кіламетраў адсюль?

Сапраўды, на кожнай дробнай рэчцы ці мелкім возеры выратавальны пост паставіць фізічна немагчыма. Няма ў краіне столькі прафесійных вадалазаў, ды і сам пост патрабуе грашовых укладанняў. 66 выратавальных станцый ахопліваюць прыкладна 1 працэнт беларускіх рэк і 3 працэнты азёр. Знаходзяцца яны, зразумела, у месцах масавага адпачынку. Адзінкавыя трагедыі здараюцца, на жаль, і там. Прычым бяда можа напаткаць як купальшчыка, так і таго, хто грэбуе правіламі паводзін у лодцы.

— Большасць людзей лічыць той жа катар ці лодку дарагой цацкай, — мяркуе начальнік Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных судах Міхаіл Чашун. — А вось цяпер давайце ўявім сабе простую сітуацыю: лодка, у якой чалавек выплыў на сярэдзіну возера, па нейкай прычыне перакулілася. Каб ускараскацца на яе зноў, трэба быць фізічна падрыхтаваным. Рыбацкая амуніцыя ці звычайная вопратка хутка намокне і будзе цягнуць уніз. Таму ў лодцы неабходна надзяваць выратавальную камізэльку ўсім, у тым ліку і дзецям. Магчыма, адчуванні будуць не зусім камфортныя, затое дома вас дачакаюцца родныя.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

■ Спажывец

VELCOM ПАВЫСІЦЬ ЦЭНЫ

Павелічэнне цэн, якое адбудзецца 27 ліпеня, закране званкі і абаненцкую плату галасавых тарыфных планаў для фізічных асоб, аднаразовыя ўнёскі і тарыфы на спецыяльныя і дадатковыя паслугі.

Павышэнне абаненцкай платы для большасці тарыфных планаў складзе ад 1,5% да 7%. Званкі ўнутры краіны падаражэюць на 4—7%. Па ацэнках кампаніі, сярэдні рахунак для абанента павысіцца на 2,7%.

Істотныя змены закрануць тарыфныя планы лінейкі «Бізнес»: павышэнне абаненцкай платы будзе суправаджацца павелічэннем колькасці ўключаных хвілін і аб'ёму інтэрнэт-трафіку.

Не зменяцца памеры штомесячных плацяжоў за абсталяванне, што набывалася ў растэрміноўку па заключаных раней дагаворах, тарыфы на выходныя міжнародныя званкі, відэазванкі, мабільны інтэрнэт (абаненцкая плата і кошт трафіку). Цэны на SMS і MMS і тарыфы на званкі ў роўмінгу таксама застануцца без змен.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■

НЕ ДАПУСЦІЦЬ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нагадаем, што з мая 2012 года на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь забаронена выкарыстанне для кармлення свіней адходаў прадуктаў харчавання, якія змяшчаюць кампаненты жывёльнага паходжання (мяса, тлушчаў, крыві і іншага).

Асобам, якія вырошчваюць свіней, крайне непажадана наведваць іншыя падворкі грамадзян, якія трымаюць свіней, і не дапускаць выгульнага ўтрымання свіней. Акрамя таго, неабходна абмежаваць наведванне ўласных падворкаў іншымі асобамі. Забой жывёл павінен праводзіцца выключна ў прысутнасці спецыялістаў ветэрынарнай службы.

Улічваючы, што вірус афрыканскай чумы можа перадавацца праз мяса і мясныя прадукты, іх неабходна набываць толькі ў гандлёвай сетцы і на гандлёвых радах рынкаў, куды прадукцыя паступае толькі пасля праходжання ў вызначаным парадку ветэрынарна-санітарнай экспертызы. Неабходна часова, па магчымасці, адмовіцца ад набыцця жывых свіней. Выкананне названых мерапрыемстваў накіравана на недапушчэнне распаўсюджвання афрыканскай чумы свіней.

З мэтай ранняга рэагавання на магчымае змяненне эпізаатычнай сітуацыі па афрыканскай чуме свіней Дэпартамент ветнагляду Беларусі звяртаецца да насельніцтва рэспублікі з просьбай: аб усіх фактах захворвання і падзяжу свіней у абавязковым парадку паведамляць дзяржаўнай ветэрынарнай службе адпаведных раёнаў або сельскім выканаўчым камітэтам. Не прымаць да прыбыцця спецыялістаў дзяржаўнай ветэрынарнай службы мер па перамяшчэнні і пахаванні здохлых свіней.

Афрыканская чума свіней для чалавека не ўяўляе небяспекі, аднак у свіней яна не падлягае лячэнню і выклікае 100-працэнтную смяротнасць.

Сяргей КУРКАЧ.

Фота БЕЛТА.

Надзвычайныя меры па лакалізацыі ачага захворвання афрыканскай чумы свіней былі прыняты не толькі ў Іўеўскім раёне, але і ў Стаўбцоўскім, Навагрудскім і Віцебскім раёнах. Там з падсобных гаспадарак было канфіскавана ўсё пагалоўе свіней, паведаміў **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід ЗАЯЦ**.

Жывёла была знішчана спецыяльным спосабам, а на месцы ўтылізацыі зроблена дэзынфекцыя грунту на глыбіню 10 сантыметраў. Знішчаны і драўляныя пабудовы, дзе ўтрымліваліся свінні. Гаспадары свіней у бліжэйшы час атрымаюць кампенсацыю — па 18,3 тысячы рублёў за кілаграм жывой вагі.

Зараз пад асобую ахову ўзяты ўсе свінакомплексы краіны, на долю якіх прыпадае каля 90 працэнтаў вытворчасці свініны ў Беларусі.

Спецыялісты нагадваюць, што афрыканская чума свіней не падлягае вакцынацыі ці лячэнню. У хворых свіней сінеюць вушы. Жывёлы адмаўляюцца ад ежы і на працягу тыдня гінуць.

■

■ Хто каго?

ДАЙ БОГ ЖЫЦЬ НА ПЕНСІІ НА КАНІ... І З ПЕСНЯМІ!

Што было — было: у Аўцюках, ля крамы, аднаму мужчынку дрэнна зрабілася — самлеў, бедны. Людзі, вядома ж, да яго — абступілі з усіх бакоў, крычаць наперабой: «Вады... Хутчэй!», «Таблетку пад язык...», «Не... Выклікайце «хуткую». У бальніцу везці трэба»...

— Дайце яму віна, — сказала бабка Маня.

Непрытомны, пачуўшы гэта, варухнуў брывом, расплюшчыў правае вочка, ледзь чутна прашаптаў: «Эй вы... Усе... Заткніцеся... Слухайце, што кажа бабуля».

І сапраўды: як не слухаць? Бо чараўніца ж: з таго свету, можна сказаць, мужчыну вярнула. Прычым — без ніякіх лекаў! Толькі слоўцам адным!

Во якім яно моцным бывае!

Ці ёсць падобныя ў конкурснай пошце? Як заўжды, мяркуйце самі. Але перш — кіньце вочкам на верхні здымак і, магчыма, разам са **спадарыняй Валянцінай Гудачковай з Жыткавічаў** успомніце:

Старых знаёмых пазнаю!
Сустрэчы з імі вельмі рада:
Ясь летась ногі мыў каню,
Цяпер — спявае серэнады...
Яно за шчасце, вы паверце,
Быць слухачом —
на тым канцэрце!

Ну яшчэ б, калі...

Льецца музыка —
фантанам!..
Ясь іграе апантана!
Ды, на жаль, тут, хоць заплач,
Усяго адзін слухач.

Зазначае гэта **спадар Міхаіл Дубовік з вёскі Арэшкавічы Бярэзінсага раёна.** Шкадуе, трэба разумець, што адзін? Але ці варта шкадаваць — на думку **спадарыні Раісы Васільевай з Гомеля** — ёсць пытанне:

Хлопец стараўся, оду складаў
Для прыгажуні-дзяўчыны,
Але «адлуп» ад яе атрымаў
Без відавочнай прычыны.
Вось і даводзіцца песню сваю
Слухаць у садзе самому.
Бо падабаецца голас... каню.
Болей, выходзіць, нікому?

Ёсць у пошце (у лісце **спадара Анатоля Гарачова з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна**) і адказ на пытанне чаму:

Хоць настырны Ясь і ўпёрты,
Спавядальнік моднага,
Конь бярэ аж тры акорды,
Ну а ён — ніводнага.

З людзьмі, на жаль, гэта часта бывае:

Наступіў мядзведзь на вуха —
Дужа ж кепска грае!
Аніхто не хоча слухаць...
Конік ледзь трывае!

Бедная жывёліна, як лічыць **Валянціна Гудачкова**. Ды і гітарыст бедны... Прычым — у поўным сэнсе гэтага слова:

Каб плацілі Ясю ў еўра,
Дык стваraў бы ён шэдэўры.
Калі ж толькі за падзяку —
Цягне нудную бадзягу.

Лічыць так **спадарыня Любоў Чыгрынава з Вілейшчыны, спадары Сцяпан Нефідовіч з Лунінеччыны і Міхаіл Дубовік з Бярэзіншчыны.** Чытайце:

Спрадвеку музыкант
у вёсцы
Жыў бедняком,
быў голы-босы.
Не лепш і зараз...
Бач, фінансы
Спяваюць сумныя рамансы.

А ўсё чаму?

Барды —
хоць і шмат шчыруюць —
Ды катэджаў не будуюць...
Каб без портак не застацца,
Можа, у конюхі падацца?

А вось гэта ўжо (ну згадзіцеся!) крайнасці. І перш чым кідацца ў іх, варта паглядзець вакол: раптам нейкае іншае выйсце ёсць?

Якое? Ну можна, напрыклад, агратурызмам заняцца. А што? Новы від дзейнасці — модны цяпер, запатрабаваны. Да таго ж у гэтага чалавека (са здымка) ужо шмат што ёсць: конь, гітара... Назва фірмы, рэклама...

Адкуль апошняе? Усё з той жа рэдакцыйнай пошты — ад **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў** — задарма аддае:

На сядзібу «Белы мак»
Шчыра запрашаем!
Гаспадар для вас — спявак,
Конік — пакатае.

Вам да гэтага далёка — пакуль? Рамонт у доме трэба зрабіць, а грошай бракуе? Тады (і з таго ж канверта) яшчэ адна падказка:

Незвычайную паслугу
Ясь-маэстра выдае:
Зранку ў дачніц ён за плугам,
А пад вечар ім пяе.

І тым самым, трэба разумець, зарабляе — на думку **спадара Уладзіміра Яцкевіча з вёскі Слонімцы Пружанскага раёна,** нават някепска. У прыватнасці:

Шмат сягоння шчыравалі —
Час прыйшоў і паляжаць.
Бульбу людцам паганялі...
Грошы ёсць —
чаму ж не йграць?

(Перапеў тут да месца — ад **спадара Міколы Кісяля з Мінска**):

Як з канём не пець? ...
Як жа не брынчэць?
Калі уся вёска
На паклон ідзець?..

А ўжо ён, гаспадар таго адзінага ў акрузе канька, можа даць яго — у тым ліку за грошы, а можа сам, што называецца, ласку зрабіць. З усімі адсюль наступствамі:

Жонка лямант усчыніла,
Ледзь гітару не пабіла:
— Працаваў з канём у Людкі?
Дык начуй цяпер ля будкі!
...Летам — люба начаваць,
Серэнады распяваць.
І слухач ёсць — сябра конік,
Ён сагрэе... Дый пракорміць.

Вось такое рашэнне (на думку **спадарыні Марыі Грышчанка з Дзяржынска**) прыняў гэты «вершнік». А мог бы, дарэчы, і іншае — відавочнае для **спадарыні Святланы Іванец з вёскі Калачы, што на Лагойшчыне:**

Калі жонка
даўно ўжо ў пячонках,
Не адолець
мужу самоту:
На кані,
з сяміструнnай сяброўкай
Ён шукае цяпло і пяшчоту.

Ці лёгка знайсці? На думку той жа Святланы — не:

Разумее нават конь:
Жарсць у песнях, што агонь...
Але гора «барадзе»:
Хто ж з босага ідзе?

І сапраўды — мала ахвотных... Ісці. А вось паразважаць, чаму ён такі (у сэнсе босы), ахвотных шмат. **Спадар Валерый Гаўрыш,** напрыклад, лічыць:

Мабыць, хлопец
схільны пець —
Не касіць пракосы.
Бо мне цяжка зразумець:
Як сягоння косю мець —
І застацца босым?

«Ды што раз плюнуць!» — як згаварыўшыся сцвярджаюць **спадары Мікола Кісель, Сцяпан Нефідовіч...** І прыводзяць канкрэтныя прыклады:

Пецю Тамара
Выгнала з хаты:
Жонкай — гітара.
Конік — за брата...
З адзежы — кашуля,
(Бот — развaліўся)...
З маёмасці — трасца...
Дайграўся, дапіўся.

Фінал, карацей... Альбо вось яшчэ адна драма:

Піў без меры —
з чаркі, з рыла,
Вось і «вольная»
ў Гаўрылы.
Кроіць сэрца
непарадак
(Атрымаў жа
пад азадак) —
А паскардзіцца каму?
Толькі вернаму каню.

Што, відаць, заканамерна:

Між жывёлін сама болей
Паслужылі людзям коні.
На іх з даўняе пары
У бой імчалі ваяры...
Як жа іх не шанаваць?
Як ім... песень не спяваць?

Пытае, прынамсі, **спадар Мікалай Старых з Гомеля.** І мае ж рацыю! Бо *пра* каня твораў багата, а вось *для*...

Хоць на думку **спадара Гарачова,** гэта і правільна, бо

Трубячы аб тым штодня,
Варта б і запомніць:
Што каня, як салаўя,
Песнямі не кормяць.

Тады чым — кормяць? **Спадар Старых** ведае:

Быў у косі Гаспадар
І канёк жыў — нібы цар!
Не ўпрагаўся ў цяжкі воз,
Еў ён бульбу і авёс...
Ды... купіў яго Міхайла
(Ёсць паўсюль такі нядбайла):
Песень мае, што вады...
А канёк — худы-худы.

Можа, ён такім, крый Бог, стане? Бо пакуль, мяркуючы па здымку... Нейкі сумны толькі...

Зрэшты, тут трэба прыгледзецца — нам... І, вядома ж, герою **спадарыні Чыгрынавай:**

Ажаргаў Тарас Пегаса
І прастуе да Парнаса.
— Эй, ачомайся, Тарас,
Можа гэта не Пегас?

А проста...

Далей — ужо вершамі, ад **спадара Альфрэда Тычко з вёскі Ідолта, што на Мёршчыне:**

Вясна —
у квецені садоў...
Бясконцы
салаўёў рулады,
Бо прагне сэрца
зноў і зноў
Спяваць каханай
серэнады...
А каб здзівіць
сваю Джульету,
Прыдумаў Янка
сцэну гэту.

«Нумар «Звязды» з чарговым конкурсным здымкам выйшаў 4 мая, якраз у самы разгар салаўіных спеваў, — піша **спадар Гаўрыш.** — Таму па вечарах проста грэх было не выходзіць на вуліцу, не слухаць гэты чароўны пошчак. Дарэчы, арнітолагі кажуць, што спявае толькі салоўка і толькі ў той перыяд, калі самачка выседжвае птушанят...»

Адкуль, відаць, і радкі:

Салавей перад салоўкай
Песняй заліваецца.
Пакуль тая птушанятак
Выседзець стараецца.
Гэты ж хлопец — ля радзільні
Жонцы арыю завёў.
Ці паможа? Невядома...
Больш бы гэткіх салаўёў!

І сапраўды — не зашкодзіла б! А то (паводле **спадарыні Чыгрынавай**) асобныя з мужоў зусім ад рук адбіліся:

Ясь шукае стыль высокі —
Спінай ловіць біятокі...
Яго жонка ў баразне
Да змяркання спіну гне.

Тутэйшая яна, трэба разумець, працаўнічка — вартая самых узнёслых вершаў! Напрыклад — ад **спадара Нефідовіча:**

У жонкі куры, свінні, градкі...
Усё дагледзіць па парадку!
Ну, а муж — «дапамагае»,
Пасвіць косю ў лузе-гаі.
Бо жыве на пенсіі
На кані і з песнямі!

От каб так — ды кожнаму!

Зрэшты, гэта — адступленне. А што да здымка, то на ім (як піша **спадарыня Іванец**) — з'ява. І зусім нярэдкая:

Саўка летам грэе плечы
На кабыле... замест печы.

Значыць хворы ён? Ці гультай? А можа, мае рацыю **спадарыня Таццяна Баркоўская з вёскі Жажэлка Смалявіцкага раёна,** калі піша:

З барадою, паглядзіце,
А ляжыць, не дзьме у вус:
Вам патрэбна? Вы й рабіце,
А я — новы беларус!
Ад агіды конік плача —
Зведаў розных седакоў,
А такіх яшчэ не бачыў —
Прахадзімцаў-лайдакоў.

Дзіўна, бо іх жа час... Як лічыць, прынамсі, **спадар Нефідовіч:**

Цяпер не трэба быць
спартсменам,
Пісьменнікам
ці бізнесменам.
А ладзь канцэрты
пад «фанеру»
І мецьмеш грошай
да халеры.

За іх — асабліва цяпер (ці вам казаць?) і робіцца, і купляецца многае... Але ж не ўсё! Вы толькі ўявіце (услед **за спадарыняй Чыгрынавай**):

Да цешчы вясною
Прыехаў зяцёк,
Гітару з сабою
У сяло прывалок.
І тупае зранку
Ля «госціка» цешча,
А зяць то зайграе,
То ў ладкі заплешча.

Больш за тое (як дадае **спадар Гарачоў**):

Грамадзяне, стаўце свечкі!
І званіце у званы —
Хоць «партэчкі па кастэчкі»,
Янка меціць у паны.
На кані, да неба тварам —
Больш ці ўбачыце мужчын?
А пры чым тады гітара?
Ды гітара — ні пры чым.

Бо (як лічыць спадар **Юрый Вінаградаў з Бабруйска**):

Не да твару казаку
Днём ляжаць у гамаку.
Вось на спіне у каня...
Ясь ляжыць...
Ляжыць штодня.

Што здзівіла **спадара Дубовіка** — адзін... Ляжыць:

Да гітары прыхіліўся...
У нязручнай позе...
Лепш бы з дзеўкаю любіўся,
Седзячы на возе!

Іншымі словамі, вы адчулі, колькі шпілек адпушчана ў адрас героя, колькі крытыкі выліта на яго галаву? Прычым — справядлівай, бо, каго ні паслухай (ну як ля таго аўцюка непрытомнага!)... усе маюць рацыю.

Як, вядома ж, і **сужэнцы Астроўскія з Мінска:**

Хай дзяцюк раздзенецца,
Хай калі й разуецца...
Як вясёлы чалавек —
Яму ўсё даруецца!

Вось на гэтай аптымістычнай ноце і завершым чарговы агляд. Што да вынікаў?

Нагадаем: на мінулым конкурсным здымку сабачка быў — у тэпціках, у жупане. Дык вось. Па меркаванні вялікага чытацкага журы найлепшыя радкі пра яго напісалі спадары Аляксандр Матошка з Расонаў, Васіль Пяшэвіч з Жыткавіччыны, Мікалай Старых з Гомеля, Альфрэд Тычко з Мёршчыны, сужэнцы Астроўскія з Мінска, Анатоль Гарачоў з Іўеўшчыны; Ніна Бурко з Бярэзіншчыны, дзве Валянціны — Гудачкова з Жыткавічаў і Пабягайла з Ляхавічаў, Марыя Грышчанка з Дзяржынска і **Раіса Васільева.** Яе радкі

(Не патрэбны многім дзеці —
З імі клопат будзеш меці...
А сабачку як прыдбаеш,
Толькі і ведай, што гуляеш.
...Як такое павядзецца,
То і люд перавядзецца.
З кім тады сабакам жыць?
Хто ім будзе порткі шыць?)

палічыла мацнейшымі і журы маленькае, рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на чацвёрты квартал гэтага года (на трэці, будзем спадзявацца, усе падпісаліся?) накіроўваецца ў Гомель.

Вызначыла пераможцу і рэдакцыя «Вожыка». Ёй стала спадарыня Соф'я Кусянкова: гэта значыць, што менавіта да яе, у вёску Лучын, што на Рагачоўшчыне, прыйдзе ліпеньскі нумар часопіса.

Хочаце, каб да вас таксама? Падпісвайцеся! І тым самым падтрымлівайце (ну хоць нечым...) — родную мову ў родным народзе...

Не выпадае? Хочаце зэканоміць? Тады ўважліва паглядзіце на чарговы конкурсны здымак, напішыце (па-беларуску, дасціпна і коратка), што б гэта значыла, і прышліце ў рэдакцыю. Шанцы выйграць ёсць! У кожнага... А яшчэ ёсць магчымасць і займець новых сяброў), адкрыць свае таленты. Дык няхай іх будзе больш — у кожнага з удзельнікаў нашага конкурсу, у кожнага з чытачоў «Звязды», у кожнага, хто робіць нешта людскае на карысць сваёй Бацькаўшчыны.

Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі на гэты раз не вытрымалі строгага конкурснага адбору.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

27 ЧЭРВЕНЯ 2013 г.
ЧАЦВЕР
№ 14 (15723)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Алена ЛАНСКАЯ:

«МАЙМУ МУЖЧЫНУ ДАВЯДЗЕЦЦА ПРЫРУЧАЦЬ «САМОТНУЮ ВАЎЧЫЦУ»

Калі парог пераступіла дзяўчына ў ружовай сукенцы і цёмных акулярах, я не адразу пазнала ў ёй Алену Ланскую. Яе па-рознаму ўспрымаюць і ацэньваюць, але спявачку гэта мала непакоіць. Яна даўно засвоіла ісціну, што добрай для ўсіх не будзеш і чужых меркаванняў не зменіш. Алена проста ідзе выбраным шляхам і імкнецца на ім не згубіць саму сябе. Таму што папросту ёсць моманты шчасця, якія варта цаніць, як бы цябе ні біла жыццё. Яна займаецца спортам, радуецца цвіценню фіялак на сваім акне, рыхтуецца да рэлізу новага альбома і пакуль толькі марыць пра адпачынак у вузкім сямейным коле. Пра рэйтынгі папулярнасці, настрой будучага дыска і пра тое, хто ёсць хто на эстрадзе, мы і разважаем сёння з Аленай Ланской.

— Зараз, калі эмоцыі і крытыка адносна конкурсу «Еўрабачанне» крыху сціхлі, хацелася б пачуць, як вы ацэньваеце зробленае?

— Мы насамрэч зрабілі шмат. І, напэўна, ніхто, акрамя тых, хто зведаў гэта на сабе, не можа ўявіць, які там аб'ём работы для артыста. Мне пашчасціла працаваць з моцнай інтэрнацыянальнай камандай. Свой уклад зрабілі Белтэлерадыёкампанія, каманда грэчаскіх стылістаў, прадзюсарскі цэнтр «Спамаш» пад кіраўніцтвам Дзмітрыя Баранава. Ён у свой час працаваў у камандзе Філіпа Кіркорава, калі рыхтавалі Дзмітрыя Калдуна на «Еўрабачанне». Я лічу, што той вопыт нам дапамог. Дзякуючы зладжанай працы вопытных людзей і добразычлівай атмасферы, у якой мы ўзаемадзейнічалі, нам удалося дасягнуць выніку. Конкурс патрабаваў выдаткаў — як маральных, фізічных, так і фінансавых. Таму я ўдзячная і ўсім сваім спонсарам, якія адгукнуліся, каб падтрымаць мяне.

— Чыя падтрымка вам найбольш дапамагала?

— У першую чаргу мяне вельмі падбардзёрвалі мае прыхільнікі. Яны штодзённа пісалі мне ва ўсіх сацыяльных сетках, расказвалі пра тое, як яны мяне любяць і жадаюць мне поспеху. І, безумоўна, мае родныя і блізкія людзі, якія падтрымліваюць мяне па жыцці.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

«Даходнае» поле

«АДМАТЫЧЫЦЬ» МІЛЬЁН У «КАПІТАЛА»

Паспрабавала карэспандэнт «Чырвонкі», правёўшы адзін дзень з падлеткамі ў летнім лагеры працы і адпачынку пад такой назвай

— Вы хочаце ПАПРАЦАВАЦЬ? — робячы прыкметны націск на апошнім слове, здзіўлена пыталіся ў мяне людзі, з якімі дамаўлялася пра рэпартаж. А што, я разумею: на вуліцы горача, а гнуць спіну сярод пустазелля — гэта вам не тэксты на клавіятуры «клацаць»! Але чаго непакоіцца: паколькі 14-гадовыя дзеці «выжываюць», ды яшчэ і зарабляюць не менш як мільён рублёў, дык няўжо я згіну?! Наўрад ці!

...Колькі дзён «маральнай» падрыхтоўкі — і вось, нарэшце... Раніца, палова дзявятай, я стаю каля сталічнага Палаца дзяцей і моладзі, без макіяжу, у кедах і з пальчаткамі ў сумцы, у чаканні аўтобуса, што павінен завезці мяне і кампанію юных «капіталістаў» некуды ў бяскрайняе поле. Ці ў цяпліцу.

У фае заўважаю некалькіх дзяўчат, якія зручна прыселі каля фантана і абмяркоўвалі нешта.

— Прабачце, а гэта не вы часам зараз працаваць едзеце? — цікаўлюся і адначасова намагаюся зразумець, з кім жа праваду гэты дзень.

— Так, так! Едзем палоць грады...

Тут, прызнацца, мяне чакала невялікая неспадзяванка. Я ведала, што працаваць належыць у агракамбінаце, але што менавіта давядзецца рабіць, невядома было да апошняга. Тут ужо мае калегі пастараліся, адпраўляючы на «заданне»: іх натрэніраваная фантазія малявала мяне і з кашом агуркоў, і падчас чатырохгадзіннага «рандэву» з клубніцамі, і нават маё расчараванне, калі замест клубнічнай плантацыі нас прывязуць, напрыклад, на баклажанавую. Але ўсё атрымалася больш празаічна: едзем змагацца з пустазеллем. Што ж, назад дарогі няма...

— Валерый Аляксандравіч, гэта журналіст, яна сёння паедзе з вамі, — знаёмяць мяне з педагогам, якому належыць нас суправаджаць. Валерый Аляксандравіч апрануты ў пазітыўную жоўтую майку, здалёку я і не адрозніла б яго ад хлопцаў, што ходзяць каля фантана ў чаканні аўтобуса.

— Ага, цудоўна! — адказаў ён з нейкай хітрай усмешкай, відаць, прадчуваючы маю рэакцыю на «поле дзейнасці», што ўбачу праз якія паўгадзіны...

...У аўтобусе нас аказалася крыху больш за дваццаць чалавек.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

А я еду, а я еду!

БУДАТРАД: КАБ ЗАПІСАЦЦА, ТРЭБА БЫЛО ПАСПЯШАЦЦА

Уладкавацца ў студэнцкі атрад — значыць, скарыстацца шанцам зарабіць, цікава адпачыць і пашырыць кола сваіх сяброў. Тут кожны сам выбірае справу па душы. За перыяд з 1 мая ў складзе студэнцкіх атрадаў пачалі працаваць 3222 чалавекі, а індывідуальна працаўладкаваліся яшчэ 347, што ў цэлым у параўнанні з мінулым годам больш на 800 чалавек. Пра перспектывы летніх працоўных канікул расказала другі сакратар грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Альбіна СЫЧЭЎСКАЯ.

— Калі казаць пра колькасць запытаў ад працадаўцаў і ахвотных працаваць, то якая тут сітуацыя?

— Па стане на чэрвень у нас ужо заключана 930 дагавораў — а гэта ў параўнанні з мінулым годам на 3 тысячы працоўных месцаў больш. Кампанія па заключэнні працоўных дагавораў пачалася яшчэ ў студзені і зараз уступае ў сваю актыўную фазу. Актыўнасць студэнтаў таксама большая, чым летась, бо нехта ўжо мае вопыт і хоча яго паўтарыць, а хтосьці чуе водгукі сяброў і таксама загарэцца жаданнем паспрабаваць. Сёлета наш студатрадаўскі рух адзначае свой 50-гадовы юбілей: у 1963 годзе першыя беларускія будаўнічыя атрады, дзе было 2,5 тысячы студэнтаў, выехалі на будаўніцтва ў Казахстан. З нагоды юбілею мы ў кожнай вобласці аб'явілі моладзевыя будоўлі. Там моладзь будзе працаваць на сацыяльна значных аб'ектах. У Гомелі — гэта падрыхтоўка горада да «Дажынак», у Магілёве — рэканструкцыя Быхаўскага замка, у Гродне — будаўніцтва моладзевага цэнтра. Сёлета мы ўзнаўляем практыку працы зводных беларуска-расійскіх атрадаў: для працы ў такіх атрадах да нас прыедуць 83 расійскія студэнты. Яны прымуць удзел у будаўніцтве Астравецкай АЭС, будуць працаваць на Талачынскім кансервавым заводзе ў Віцебскай вобласці, а таксама на будаўніцтве сацыяльна значных аб'ектаў у Мінску. Са свайго боку мы адпраўляем 129 чалавек на працу ў складзе расійска-беларускіх атрадаў у Расію.

Адпраўка студэнцкай моладзі за межы краіны не з'яўляецца прыярытэтным накірункам працы. Для нас важна знайсці працоўныя месцы для маладых людзей у Беларусі. Заключаючы дагаворы з наймальнікамі за мяжой, мы адсочваем і ўлічваем такія моманты, як умовы пражывання, узровень заработнай платы.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
27 06 2013 г.

Было б жаданнё!

КАНІКУЛЫ Ў ГОРАДЗЕ: адпачыць і зарабіць

Адразу пасля фінішу чарговага навучальнага года шматтысячная армія шкаляроў разыходзіцца на тры летнія месяцы хто куды. Адны едуць з бацькамі на замежныя курорты, іншыя адпраўляюцца ў лагер адпачынку, а хтосьці па розных прычынах бавіць час у горадзе.
Каб падлеткі не бадзяліся цэлымі днямі абы-дзе, а заняліся карыснай справай, некаторыя бацькі пачынаюць шукаць для іх пасільную працу. А заадно і прывучаюць да дарослага жыцця.

— Свае першыя грошы я зарабіў шэсць гадоў таму. Мне тады было пятнаццаць, — расказвае студэнт Сяргей. — Тата працаваў на невялічкім заводзе і ўладкаваў мяне туды дворнікам на палову стаўкі. З мінусаў адзначу тое, што ўставаць даводзілася а палове шостай раніцы. Усё-такі ехаць праз увесь горад, а рабочы дзень у мяне пачынаўся а сёмай. Чатыры гадзіны зранку мятлой адмахаў, а пасля вольны. Так я за два месяцы зарабіў суму, крыху большую за дзвесце долараў. Даклаў невялічкія зберажэнні ад школьных сняданкаў — і набыў сабе выдатны па тых часах мабільны тэлефон.

Але ж бацькі не заўсёды могуць уладкаваць падлетка да сябе на працу. Звязана гэта і з вытворчай спецыфікай, і з пэўнымі абмежаваннямі па ўзросце. І што застаецца рабіць юнакам і дзяўчатам?

Выхад просты — звярнуцца ў раённы цэнтр занятасці. Менавіта туды сцякаецца ўся інфармацыя аб вакансіях у горадзе. У камп'ютарнай базе змяшчаюцца і патрабаванні да шукальнікаў працы...

Дык вось, вакансіі для 14-16-гадовых падлеткаў ёсць. Праўда, з першага разу іх удалося адшукаць не так і шмат. Грошы прапаноўваюць для дарослага невялікія, але для падлетка неблагія — паўтара-два мільёны рублёў. Выбар прафесій, вядома, абмежаваны — расклейшчык аб'яў, прадавец на летні сезон, пешы кур'ер, мерчандайзер... А вось дворнікаў бяруць чамусьці толькі з атэстатам аб сярэдняй адукацыі.

Усё было б добра, аднак узнікла адно пытанне. Той жа чатырнаццацігадовы падлетак можа працаваць у дзень не больш за чатыры з паловай гадзіны. Для шаснаццацігадовага працоўны час павялічваецца да сямі гадзін. Прычым юнаму працаўніку павінны плаціць так, як і дарасламу, які адпрацаваў поўны дзень. Ці кожны наймальнік адважыцца на гэта?

Уладкавацца ж падлетку на працу проста — дастаткова зарэгістравацца ў раённым цэнтры занятасці, дзе яму выдадуць накіраванне на патрэбны аб'ект.

Альтэрнатыва ёсць: у расклейшчыка аб'яў працоўны графік куды больш гібкі. Зарплату абяцаюць здзельную. Дзе-нідзе за тысячу расклееных лісткоў заплацяць сто тысяч рублёў.

— На кішэнныя выдаткі падлеткі могуць зарабіць улетку ў звычайных школах ці ў цэнтрах пазашкольнай працы. Напрыклад, за зборку ці рамонт мэблі, прыбіранне смецця ў будынку ці на школьным двары, падклейванне кніг у бібліятэцы, афармленне кабінетаў ці музея... Не хочацца ўлетку ісці ў школу — калі ласка, у заапарку юнакам і дзяўчатам гатовы прапанаваць працу нарыхтоўшчыка кармоў. Усяго ж у сталіцы спецыяльна для падлеткаў створана 2785 працоўных месцаў, — паведамілі «Чырвонцы» ў Камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама. — Арганізаваны яны за кошт сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны краіны, мясцовых бюджэтаў і непасрэдна саміх наймальнікаў. Уладкавацца ж падлетку на працу проста — дастаткова зарэгістравацца ў раённым цэнтры занятасці, дзе яму выдадуць накіраванне на патрэбны аб'ект.

У сярэднім 15-гадовы падлетак можа разлічваць на зарплату ў 887 тысяч за поўны адпрацаваны месяц. Тыя ж, хто мае ў кішэні атэстат аб сярэдняй адукацыі, могуць атрымаць прыкладна 1 млн 350 тысяч, паколькі ў іх значна большы выбар месцаў для працаўладкавання. Зрэшты, гэтыя сумы не лімітаваны. Так, некаторыя арганізацыі прамысловасці, гандлю, жыллёва-камунальнай гаспадаркі гатовы плаціць падлеткам ад 1,5 мільёна. Таму праблем з пошукам занятку на лета няма. Было б жаданне!

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Уласны кашалёк

ЛЕТА ЯСНАЕ МАНІЦЬ РУБЛЁМ,

або Як падлетку вырашыць праблему «кішэнных грошай»

Лета — час, калі школьнікі не толькі адпачываюць, але і спрабуюць зарабіць свае першыя ўласныя грошы. Як? У адпаведнасці са сваімі здольнасцямі і магчымасцямі...

ПРАДАЕ КВАС

— Летам шукала працу: не хацелася паміж 10-м і 11-м класамі губляць час, ды і зарабіць нешта было б няблага. У інтэрнэце знайшла аб'яву пра вакансію прадаўца квасу. Патэлефанавала, пад'ехала ў офіс, там аформіла дакументы, выбрала «кропку» (месца, дзе потым працавала) і прайшла элементарны інструктаж. Які тэрмін годнасці квасу, да якой рыскі наліваць... Дарэчы, санкніжку не вельмі патрабавалі, хапіла даведкі з паліклінікі, што здаровая. Выйшла на працу: з 9-й да 21-й гадзіны квас прадаваць. Тым летам плацілі па 100 тысяч за дзень, ну і плюс невялічкі працэнт з кожнай бочкі. Працавала, вядома, не адна: чаргаваліся са зменшчыцай па графіку «як дамовіліся». Нядрэнная праца, хіба што сумнавата і вельмі горача летам. Затое прачытала шмат кніжак, пакуль сядзела і чакала наступнага кліента, — расказвае **Ліза Таран** (17 гадоў).

ЗАБІВАЕ ЦВІКІ

— Працаваў на заводзе «праз знаёмства». Забіваў цвікі. Аплата — здзельная (чытай: працаваў шмат, інтэнсіўна і без перапынкаў!), таму за 8 рабочых дзён «падняў» 800 тысяч. Цікава было толькі першыя некалькі дзён. Потым надакучыла, не цярпелася хутчэй скончыць працу і вярнуцца дадому. Не вельмі стамляўся, больш проста хацелася змяніць абстаноўку. Добрая праца, калі трэба хутка зарабіць, але ўсё жыццё так працаваць — не, ніколі! — прыгадвае ўласны досвед **Арсеній Ворган** (16 гадоў).

РАСКЛЕЙВАЕ АБ'ЯВЫ

— Я цэлы месяц уставала ў 6 гадзін раніцы і ішла расклейваць аб'явы. Плацілі малавата (можа, рублёў па сто за лісток), але мне проста падабалася зарабляць уласныя грошы. Вядома, не паўсядзённая праца, з якой можна карміцца і жыць, але цікавы эксперымент. Калі я распавяла сябрам, куды пайшла працаваць, усе здзівіліся: у цябе, маўляў, і так бацькі не бедныя, нашто яшчэ такія пакуты... Якія пакуты? Я сябе паўгода не магла прымусіць заняцца бегам па раніцах. А тут ужо прыйшлося, абавязак. І бегала, і грошы атрымлівала, — смяецца **Кацярына Лазняк** (15 гадоў).

ГАНДЛЮЕ МАРОЗІВАМ

— Доўга шукала працу на лета, пачала яшчэ вясной. Пыталася ў знаёмых, праглядала аб'явы ў інтэрнэце, усё ніяк не магла знайсці прыдатную. То занадта мала плацяць, то я не падыходжу — ці вельмі маладая, ці таму, што без адукацыі. Нарэшце знайшла аб'яву — прадавец марозіва. Бачылі кіёскі з марозівам розных гатункаў, якое шарыкамі накладваюць у ражкі і бяруць утрая даражэй? Я ў такім прапрацавала з месяц. Графік — з 10 да 19 гадзін, выхадныя дагаворныя, у дзень плацілі 80 тысяч. Спачатку, вядома, пабойвалася працаваць з вялікімі грашыма (у спякотныя дні дзённая каса была больш за 2 мільёны), а потым прывыкла і нават стала атрымліваць задавальненне, — дзеліцца **Таццяна Ваславёнак** (16 гадоў).

ПЕРАПІСВАЕ РЭКЛАМУ

— Да нас яшчэ ў 10-м класе прыйшлі нейкія хлопцы-студэнты, напісалі на дошцы свой e-mail і прапанавалі працу тым, хто добра ведае рускую мову. Завецца гэта рэрайтынг, а праца даволі простая: трэба для ўсялякіх сайтаў, якія прапануюць розныя паслугі, тавары, пісаць рэкламныя тэксты. «Як можна нашай мэбляй у розных стылях аформіць кватэру...», напрыклад. Вядома, прыдумляць кучы такіх тэкстаў ніхто б самастойна не стаў, таму іх трэба было перапісваць. Табе іх капіруюць з іншых сайтаў, а ты перапішы іншымі словамі, іншыя назвы паўстаўляй — вось і ўся праца. Не вельмі складана, больш моташна. Плацілі не вельмі шмат спачатку, па 2 тысячы рублёў за тысячу знакаў. Але ж вось перапішаш дзясятак такіх тэкстаў — і сотня ў кішэні. Падчас вучобы — нядрэнная падпрацоўка. А летам я ўжо паглядзела ў інтэрнэце, знайшла аналагічную працу, але па лепшым тарыфе, перапісвала недзе па 20 тысяч знакаў кожны дзень. За месяц зарабіла больш за тры мільёны, — сцвярджае **Ганна Троніна** (17 гадоў).

РАССТАЎЛЯЕ ТАВАР

— Знайшла аб'яву на нейкім сайце аб працы ў прадуктовай краме. Трэба расстаўляць прадукты на паліцах, калі што — рэзаць хлеб, каўбасу. Дапамагаць, карацей. Плацілі добра: з усялякімі надбаўкамі, калі даводзілася заставацца даўжэй, калі замяняла кагосьці, калі прыбытак быў добры ў краме. Уражанні? Стамлялася моцна спачатку за цэлы дзень, затое хоць было чым заняцца, не змарнавала проста так усё лета. Навошта пайшла? Ну, як усе: каб не зусім бескарысна час правесці і пры гэтым не сядзець на шыі ў бацькоў хаця б летам. Афіцыйны аклад быў недзе каля двух мільёнаў, ды яшчэ прэміі... За два месяцы працы атрымала даволі шмат: тэлефон сабе купіла, усё лета сама сябе карміла, ну і на адзенне восенню таксама хапіла, — падсумоўвае вынікі сваёй падпрацоўкі **Паліна Паслед** (17 гадоў).

*А нехта нават зарабляе не самым «правільным» для падлетка спосабам, але даволі ўдала. Як, напрыклад, **Ігар Мядзведзь** (16 гадоў), які...*

ГУЛЯЕ Ў ПОКЕР У ІНТЭРНЭЦЕ

— У большасці ў галовах пры спалучэнні слоў «карты, грошы, гульня» часцей за ўсё адбываецца «дэтанацыя», і ніякія тлумачэнні, што покер бліжэй да спартыўных, чым да азартных гульняў, не дапамагаюць, — распавядае пра свой незвычайны занятак Ігар. — Пачынаў гуляць, выйграўшы пару долараў у віктарыне (нічога не ўкладваў), і потым паціху «разгойдваўся» да бягучых $650 (узімку было толькі 100). Гэта, вядома, не гульня ў казіно, стаўкі невялікія, максімум долар-два (каб не абанкруціцца), і зарабляць усур'ёз пачынаеш толькі тады, калі добра ўмееш гуляць і маеш вопыт. Трэба ўлічваць, што шанцаванне таксама мае месца, і таму нярэдка здараюцца дні, калі ты гуляеш добра, але ўсё роўна прайграеш, а нехта гуляе дрэнна, і пры гэтым выйграе. Аднак чым больш гуляеш, тым менш фактар удачы адбіваецца на выніку. Зараз я ў вольны час зарабляю недзе 2-3 долары ў гадзіну. Планую за лета нядрэнна падзарабіць. Бацькі спачатку вельмі недаверліва ставіліся да гэтага майго «хобі», але калі я пераадолеў планку ў $100, яны зразумелі, што гэта не пустая трата часу. Зараз, калі яны ўжо ведаюць, што я акуратна стаўлюся да грошай, не дам сабе абанкруціцца, нават заахвочваюць мяне. Дарэчы, усе сайты, дзе можна гуляць на грошы, пільна сочаць за ўзроставым цэнзам 18+. Тут мне дапамог бацька — у сеціве я з яго «данымі» гуляю.

Кацярына ЖОРАВА.
Фота Надзеі БУЖАН.

«АДМАТЫЧЫЦЬ» МІЛЬЁН У «КАПІТАЛА»

На вялізным капусным полі мы здаваліся «дробным дапаўненнем» пейзажу.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— А вы хто? — адразу заўважае «не сваіх» чарнявы хлапчук.

— Я вам сёння буду бясплатна дапамагаць. Вы не супраць?

— Ну добра...

Пытанне пра тое, чаму, навошта і дзеля чаго гэтая дапамога, патанула ў грукаце. Аўтобус завёўся...

...Як кажуць, ехалі ціха, у аўтобусе быў Wi-Fi... Наконт такога суперсучаснага транспарту жартую, зразумела. Проста была раніца, таму адны хацелі спаць, іншыя глядзелі на планшэце відэа, чыталі кніжкі альбо слухалі музыку. Толькі на апошнім сядзенні хлопец у беласнежнай майцы бясконца сыпаў жартамі. Насуняправдзём чатыры гадзіны. Рады капусты цягнуліся да гарызонту, на небе — ні хмурынкі. Бліжэйшы цень — пад разгалістай сасной, на якой, калі верыць папярэджванням маіх новых сяброў, «сядзяць кляшчы».

— Мы тут нядаўна яшчэ і лася бачылі, — дапоўнілі карціну апошнім значным штрыхом.

Але насалоджвацца прыродай доўга не далі, брыгадзір Вольга Мікалаеўна забрала мяне і яшчэ пяць дзяўчат і павяла ў далёкі канец поля. Нам далі матыкі і паказалі на зарослы ўчастак. Сказаць, што там было шмат пустазелля, — гэта нічога не сказаць! Але сонца не было яшчэ ў зеніце, а ў руках і нагах пакуль не адчувалася стомы, таму мы з дзяўчатамі дружна ўзяліся за справу і заадно — пазнаёміліся лепш. У адной кампаніі я аказалася з Наташай, Веранікай, Вікай, Алісай і Машай. Дзяўчатам па 14—15 гадоў, а ўвогуле ў «Капітал» прымаюць падлеткаў ад 14 да 17 гадоў. Усяго за лета — тры змены.

— Я застаюся на ўсе: мне няма куды ехаць, ды і грошы лішнімі не будуць, — разважае Аліса.

Мы пакуль што яшчэ з энтузіязмам сячом пустазелле вакол капусты, побач дзелавіта махае матыкай хлопец па імені Рома. Ён да справы падышоў па-мужчынску, таму прынёс з дому брусок, каб тачыць не надта вострую прыладу працы.

— Ро-о-ма, ты мужчына ці не? Вырві гэта, калі ласка! — просіць адна з дзяўчат, паказваючы на куст конскага шчаўя, які ёй ледзь не па пояс.

...Прайшло зусім няшмат часу, дзесьці паўгадзіны, а ў галаву ўжо прыкметна прыпякае, скура на руках пачырванела, наперадзе — нашмат больш капусты, чым засталося ззаду. Мае кампаньёнкі пасля амаль дваццаці дзён такога бясплатнага «салярыя» ўжо загарэлыя і да любых цеплавых нечаканасцяў гатовы, таму дастаюць з сумак кепкі.

Тут удалечыні замільгацеў наш «жоўты настаўнік» Валерый Аляксандравіч. Ён нешта цягнуў у руках, а калі падышоў бліжэй, мы зразумелі, што гэтае «нешта» — вада. Праз некаторы час да дзяўчат «прыйшоў» і перакус: смятаннікі і пачак вафляў.

Наташа, Віка, Аліса і Вераніка ў «пустазеллевых джунглях».

працаяго сядзелі дзяўчаты ў відавочна не «рабочых» сукенках і ў абутку на невялікіх абцасіках. Мяне паціху адольвала пачуццё, што нейкага няправільнага дрэскоду я прытрымлівалася, апранаючы на поле джынсы і абуўшы кеды. Як аказалася, «модныя» дзеці возяць з сабой на працу зменныя адзенне і абутак, бо пасля вяртання ў горад многія застаюцца ў Палацы дзяцей і моладзі да вечара.

Між тым, аўтобус ужо збочыў з асфальту на лясную дарогу і мы ўбачылі поле, на якім сёння гняздо з чатырма яйкамі, якія настолькі зліваліся па колеры з шэрай сухой травой, з якой гняздо было звіта, што іх заўважыць было вельмі цяжка. А тут яшчэ ў чарговы раз прыйшоў Валерый Аляксандравіч і паведаміў, што непадалёку зноў бачыў лася.

Час ішоў хутка, але не бег так, як хацелася б. З непрывычкі я нацерла на руках мазалі, кеды былі поўныя пяску, а спіна ныла. Стаміліся і мае суседкі. Мы, дарэчы, працавалі без саракахвіліннага перапынку, ад якога адмовіліся, каб раней пайсці чакаць аўтобус. Час працы скончыўся якраз тады, калі мае ногі і рукі ўжо гатовы былі адмовіцца ўдзельнічаць у гэтым журналісцкім эксперыменце.

— Мы раней палолі буракі, а яшчэ — рамонкі. Вось на якім полі былі, — паказала мне здымак Аліса, пакуль мы ішлі, каб схавацца ў цень.

Можна падумаць, што самае цікавае ўжо скончылася, але гэта не так. Чакаць аўтобус патрэбна было яшчэ гадзіну, таму мы селі пад той самай «клешчавой» сасной, дапілі і даелі рэшткі сваіх

І мы ўбачылі поле, на якім сёння правядзём чатыры гадзіны. Рады капусты цягнуліся да гарызонту, на небе — ні хмурынкі.

— Ты ўсё ўзяла? А ты? Адкуль я ведаю, а раптам вы капусту жуяце? — «кантраляваў сітуацыю» настаўнік.

Хуценька разабраўшы ўсё, працягваем змагацца з пустазеллем. Я на той момант паспела ацаніць, што праца не самая лёгкая, але дзяўчаты не скардзіліся.

— Няўжо вам, гарадскім дзецям, звыкла палоць грады?

— Так, нармальная праца. У прынцыпе, для нас гэта самы «даходны» спосаб падзарабіць летам. 14-гадовым падлеткам не так ужо і лёгка кудысьці ўладкавацца, — дзелавіта патлумачыла Наташа.

За адну змену, працуючы кожны дзень па чатыры гадзіны, дзеці атрымліваюць у лагеры зарплату ў сярэднім 1 мільён рублёў.

...А сонца грэла ўсё мацней і мацней, ды і стомленасць адчувалася ўсё больш...

Нашу працу перапыніла... жаба, якую хтосьці разгледзеў у пустазеллі. Яе хуценька ўзялі ў рукі і панеслі да дзяўчынкі Тані, якая працавала недалёка і «славілася» тым, што падымала крык, нават калі бачыла простага чарвяка. Зразумела, праз імгненне мы пачулі, якое гукавое суправаджэнне можа стварыць для кампаніі «капіталістаў» звычайная невялікая жабка. Нашы капусныя «джунглі», дарэчы, аказаліся багатымі на жыўнасць. Праз некалькі хвілін я знайшла птушыны запасаў, пагаварылі пра рознае, а Аліса паказала мне некалькі матэматычных і картачных фокусаў і нават падарыла раздрукаваныя інструкцыі, каб я змагла іх паўтарыць. У гэты час хлопцы зрабілі з бутэлек вароты і гулялі ў футбол, а дзяўчаты за гульнёй назіралі.

...Едучы дадому, я пазірала на свае джынсы, якія на каленках былі зялёнымі ад травы, і думала, што апошні раз такое здаралася са мной гадоў дзесяць таму. І хоць вярталася вельмі стомленай, у душы было адчуванне, што я даўно так бесклапотна не бавіла час. Нават і забылася спытаць, колькі б я зарабіла за дзень, калі б сапраўды спрабавала стварыць свой першы «капітал».

Ганна ГАРУСТОВІЧ.
Фота аўтара.

Карэспандэнт «Чырвонкі» ад «капіталістаў» старалася не адставаць.

...ТРЭБА БЫЛО ПАСПЯШАЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Пакуль працуем пераважна з тымі наймальнікамі, якія добра зарэкамендавалі сябе і з якімі супрацоўнічаем не першы год. З'яўляюцца і новыя. Інфармацыя пра тое, што беларускія студэнты добра працуюць, хутка распаўсюджваецца. І сёння мы маем магчымасць выбіраць тыя прапановы, якія нас цікавяць, а не згаджацца на ўсё, што ёсць.

Альбіна СЫЧЭЎСКАЯ.

— Ці адрозніваюцца вашы патрабаванні ў дачыненні да замежных наймальнікаў?

— Патрабаванні да ўсіх аднолькавыя. Тут важна адсочваць усе пытанні, што датычацца нарматыўных дакументаў, тэхнікі бяспекі, бытавых умоў. Арганізацыя, харчаванне, праезд павінны адпавядаць агавораным патрабаванням. Плануючы супрацоўнічаць з новым наймальнікам, мы выязджаем на месца будучай працы і ацэньваем умовы. Наведваем атрады і падчас працы. Таксама збіраем водгукі і прапановы студэнтаў па выніках працоўнага семестра. Існуе шэраг пытанняў, якія патрабуюць дапрацоўкі. Так, напрыклад, узнікаюць праблемы пры падачы дакументаў на падаткаабкладанне. Тут ёсць нюансы нават у тэрмінах падачы. У Беларусі ўдзельнікі студэнцкіх атрадаў вызвалены ад выплаты падаходнага падатку, а на тэрыторыі РФ нашы студэнты плацяць 30% падатку, бо не з'яўляюцца рэзідэнтамі Расійскай Федэрацыі. Расійскія студэнцкія атрады, працуючы ў сябе на радзіме, плацяць 13% падаходнага падатку. Таму нават пры арганізацыі зводных атрадаў стараемся такія пытанні рэгуляваць.

— Якія асноўныя кірункі дзейнасці студэнцкіх атрадаў?

— У нас дзейнічаюць педагагічныя, будаўнічыя, сэрвісныя, экалагічныя і сельскагаспадарчыя атрады. Ёсць таксама добраахвотныя, калі маладыя людзі працуюць на будаўніцтве храмаў, добраўпарадкаванні тэрыторый. Дарэчы, апошнія сёння вельмі папулярныя сярод моладзі. Сярод такіх атрадаў мы сумесна з Міністэрствам прыроды і аховы навакольнага асяроддзя праводзім конкурс на званне лепшага. Не выключана, што ў перспектыве ў нас з'явяцца і новыя кірункі. Зараз працуем над тым, каб асобным профілем зрабіць ІТ-атрады.

— Што неабходна студэнту, каб трапіць у атрад «байцоў»?

— Медыцынскі допуск для выканання таго ці іншага віду работ, адсутнасць акадэмічных запазычанасцяў. Прычым гэта датычыцца як студэнтаў, так і школьнікаў. Пры сабе трэба мець пашпарт і членскі білет. Тыя маладыя людзі, хто актыўна праяўляе сябе ў жыцці БРСМ на працягу ўсяго навучальнага года, маюць магчымасць выбіраць найбольш цікавыя месцы для працы.

— А калі звернуцца навучэнцы з абмежаванымі магчымасцямі?

— Практыкуем індывідуальны падыход, хаця гаварыць пра шырокі кірунак дзейнасці тут не даводзіцца. Калі да нас звяртаюцца такія навучэнцы, то мы падбіраем месца працы ці займаемся пошукам наймальніка, які будзе адпавядаць запытам канкрэтнага чалавека. Нікога не пакідаем без увагі.

— А што можаце сказаць пра памеры заработнай платы?

— Пакуль мы можам толькі прагназаваць, бо лічбы толькі стартавыя. Трэба разумець, што проста за тое, што малады чалавек прыйшоў у студэнцкі атрад ці ўладкаваўся на працу індывідуальна, грошай яму не заплацяць. Павінен быць выкананы замоўлены аб'ём работ. Трэба таксама ўлічваць, што многія наймальнікі забяспечваюць да заработнай платы за свой кошт праезд, харчаванне і пражыванне ўдзельнікаў атрада. Калі, напрыклад, чалавека наймаюць для працы на тры гадзіны ў дзень, то і заробак будзе адпаведны гэтаму. Як вынікае з прапаноў на нашым сайце, зарабіць можна ад 3 да 6 мільёнаў рублёў.

— Дзе можна даведацца пра вакансіі ў студэнцкіх атрадах?

— Зараз інфармацыю можна знайсці на нашых электронных рэсурсах. Там можна і заяўку пакінуць, і азнаёміцца з прапановамі, якія яшчэ засталіся. Па інфармацыю можна звяртацца таксама ў пярвічныя арганізацыі сваіх навучальных устаноў і раённыя арганізацыі БРСМ. Але найбольш запатрабаваныя вакансіі ўжо даўно занятыя. Бо многія студэнты, адпрацаваўшы ў студэнцкім атрадзе летась, на гэты год паспяшаліся запісацца яшчэ зімой.

Алена ДРАПКО.

Хуткія і лоўкія

ТАМУ ШТО ЯНЫ — «ЯСТРАБЫ»!

На Лагойшчыне прайшоў X юбілейны абласны лагер «Юны выратавальнік» і злёт абласнога аддзялення Беларускай моладзевай грамадскай арганізацыі выратавальнікаў-пажарных. Цягам некалькіх дзён удзельнікам выпала напружана змагацца, трэніравацца і, безумоўна, адпачываць.

У першы дзень юныя выратавальнікі разбілі палатачныя гарадкі. Напрыклад, каманда «Прымус» з Маладзечна на сваёй тэрыторыі разгарнула цэлую «планету МНС» і падрыхтавала торт да юбілею лагера. Казачныя вершы ад Радзівілаў прэзентавала каманда «Ястрабы» з Нясвіжскага раёна. Рыцарскія баі прайшлі ў лагеры Барысаўскага раёна.

Наступным днём падлеткаў чакала камбінаваная эстафета з 24 этапаў. Даказваць сваю сілу, хуткасць і лоўкасць юныя выратавальнікі маглі пры манеўраванні з вазком, пераносцы пацярпелага, праходжанні паласы з завязанымі вачыма, кіданні валана і забіванні цвікоў. Эмоцыі папросту перапаўнялі ўдзельнікаў!

Наступным днём спаборніцтваў у конкурсе-аглядзе песні і строю ўсе дэманстравалі сваю выпраўку і ўменне дзейнічаць зладжана. Прычым разам з хлопчыкамі ў страі крочылі і дзяўчынкі. Затым каманды змагаліся за званне лепшых у конкурсе «Аказанне першай даўрачэбнай дапамогі». Па пяць чалавек ад кожнай каманды спаборнічалі і ў веданні асноў бяспекі жыццядзейнасці. Увечары ўсіх чакаў юмарыстычны конкурс на лепшае агучванне відэароліка і песні каля вогнішча. Кожны вечар узнагародай за напружаны дзень для ўдзельнікаў злёту была дыскатэка, а на закрыццё — святочны феерверк.

Па выніках спаборніцтваў трэцяе месца заняла каманда Клецкага раёна, другое месца — каманда Барысаўскага раёна. Ганаровае першае месца заняла каманда Нясвіжскага раёна «Ястрабы».

Сяргей СТАРЫНАЎ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
27 06 2013 г.

Быць самім сабой

НАДЫШОЎ «ЧАС ЖЫЦЬ!»

або Творчасць як панацэя

Як думаеце, чым займаюцца сённяшнія падлеткі? Калі шчыра, амаль усе яны толькі і робяць, што бясконца «юзаюць» свае гаджэты, разам са старэйшымі сябрамі ў навакольных пад'ездах ці дварах смакуюць піва, а пасля — і гарэлку... На «хаце» ў якіх-небудзь «прасунутых» знаёмых спрабуюць курыць «траву» — быццам бы зусім бясшкоднае рэчыва. Закахаўшыся, яны прысвячаюць песні ў стылі рэп сваім палавінкам, а пасля вырашаюць, што трэба пераходзіць да наступнага этапу... І вось ужо хлопчык-школьнік расказвае мне, што са жніўня хоча здымаць кватэру са сваёй дзяўчынкай, толькі бацька яму не дазваляе... Паспрабаваўшы ўсё вельмі рана і рана ж расчараваўшыся, так і не знайшоўшы сябе, яны зведваюць адчай і нават думаюць пра суіцыд... Дык што ж такое жыццё і на што яго лепш патраціць?..

Марына Валасковіч.

ДУМКІ ЎГОЛАС

Знайшоўся адзін неабыякавы чалавек, які рызыкнуў даць адказ на апошняе, зусім не простае пытанне. Прычым даць такі адказ не толькі сабе, але і іншым — тым, хто знаходзіцца побач, каго прыручыў... Чалавек гэты — псіхолаг Маладзечанскага каледжа імя Міхаіла-Клеафаса Агінскага Марына Валасковіч. Спачатку да яе на прыём прыходзілі некаторыя навучэнцы музычылішча — дзяліліся патаемным, казалі, што яны ў адчаі, што часам не разумеюць сэнсу існавання. Хтосьці з болем у сэрцы прызнаваўся, што яго каханне рухнула, што ён больш не ведае, навошта жыць... Марына Валасковіч ратавала іх, як магла: слухала, абмяркоўвала праблему, супераживала і падбадзёрвала. Аднак гэта ёй падалося недастатковым. Трэба было шукаць іншы фармат, дзе самыя набалелыя пытанні і думкі можна было б выказаць уголас, сабе самому...

Наступным крокам стала стварэнне клуба «Дыялог+», куды прыходзіць маглі ўсе ахвотныя, а не толькі навучэнцы музычылішча. Аўтар гэтага артыкула таксама наведвала клуб. Што мы рабілі там? Гутарылі пра жыццё. Абмяркоўвалі праблемы і ўсёй групай шукалі выйсце. Абуджаліся ад лёгкага суму і паўсну, натхняліся на творчасць, пачыналі верыць у свой уласны патэнцыял. Аднак і гэтага няўрымслівай Марыне Валасковіч, у якой сэрца баліць за ўсіх, падалося мала. Вынікам гэтай няўрымслівасці стала стварэнне фестывалю-конкурсу моладзевых творчых ініцыятыў «Час жыць!»

Марына Валасковіч з удзельнікамі фестывалю (трэцяя справа).

МАЛАДЗЕЧНА І ТАРОНТА: ШТО АГУЛЬНАГА?

Сёлета фестываль прайшоў ужо ў трэці раз. І калі напачатку ён быў проста падзеяй мясцовага значэння, дык у апошні раз падчас яго правядзення гараджане казалі: «Маладзечна ўскалыхнулася на два дні. Добра, што ёсць куды пайсці!» А работы на конкурс ужо не толькі прыносілі навучэнцы розных устаноў горада і раёна, але і дасылалі, напрыклад, з расійскага Магнітагорска, і нават з канадскага Таронта!

Які, аказваецца, велізарны станоўчы эфект можа мець неабыякавасць аднаго канкрэтнага чалавека! Ініцыятыва мясцовага псіхолага скончылася гуляннем цэлага горада і абуджэннем творчай актыўнасці многіх маладых людзей. І гэта толькі пачатак!

Фестываль набраў абароты надзіва хутка. Традыцыйныя намінацыі засталіся папулярнымі. Пералічыць іх усе — са шматлікімі пераможцамі, узнагароджанымі дыпломамі рознай ступені, — проста нерэальна. Але варта адзначыць асноўныя, каб уявіць, у якой з іх можна будзе прыняць удзел наступнай вясной, і назваць уладальнікаў дыпломаў першай ступені ў кожнай з іх адпаведна: «Эстраднае выкананне» (гурт «Кола» з Лагойска), «Аўтарская песня» (Марына Харлап), «Бардаўская песня» (Марыя Гаўрыленка), «Вершы» (Яна Галіцкая), «Проза» (Вераніка Соніч), «Выяўленчае мастацтва» (Паліна Пашук, Міхал Кляпец). Акрамя таго, сёлета выступаў тэатр ценяў, былі хлопцы, якія чыталі рэп, а Гран-пры ў музычнай намінацыі атрымала бард Таццяна Беланогая.

Аднак на гэтым фэсце выбраць лепшых — не галоўнае. Натуральна, той, хто трапіў у спісы пераможцаў, атрымаў не толькі маральнае задавальненне, але і грунтоўную падставу, каб працягваць тварыць... І ўсё ж галоўная мэта — творчасць як альтэрнатыва душэўнаму і фізічнаму самазнішчэнню, творчасць як праява сапраўднага жыцця. Ніхто не імкнецца быць падобным на кагосьці, не ставіць перад сабой задачу дасягнуць пэўнай «планкі». Усё, што робіцца, — робіцца дзеля таго, каб атрымаць асалоду ад жыцця, дзеля самога жыцця, сапраўднага, у якім кожны з нас — рэальны ўдзельнік, а не выпадковы сведка, не назіральнік за чужым святам.

Калі я трапіла на фестываль «Час жыць!», калі сама паўдзельнічала ў дзвюх намінацыях (паэтычнай і тэатральнай — разам з эксперыментальным тэатрам «Галава-нага») і папрысутнічала на ўсёй канцэртнай праграме канкурсантаў, з'явілася адчуванне... чагосьці вельмі сапраўднага. Мяне нават дзівіла, як усё тут праўдзіва, як не падобна на тое, што паказваюць па тэлебачанні. Ніхто з гэтых творцаў не імкнецца паехаць на «Еўрабачанне», не прэтэндуе на званне лепшага паэта сучаснасці. Галоўнае тут — не проста данесці штосьці да іншых, а... зразумець сябе самога. І гэта кранае, пранікае ў самыя глыбіні душы. Такое падрабкай ці аднадзёнкай ніяк не назавеш. Галоўны крытэрый — быць сабой.

Падчас флэшмобу «Сустрэча з продкамі».

ПАД ГУКІ ПАЛАНЭЗА

«Хочам дастукацца да ўсяго горада!» — так асабіста я сфармулявала б мэту флэшмобаў, якія на фестывалі ладзяцца кожны год. Сёлета атрымалася паўдзельнічаць у адным і ў мяне. Мне сказалі: «Ёсць народны строй, трэба пабыць прадстаўніцай продкаў і пранесці па плошчы свечку», — вось і ўсё, нічога складанага. Я згадзілася, аднак такога ніяк не чакала...

Наперадзе ішла пара — ён і яна, за імі — дзве вялізныя калоны людзей у вопратцы розных эпох — быццам продкі яго і яе. Маладыя пакланіліся першымі. Далей кожнае «пакаленне» быццам бы прымала паклон, разварочвалася і кланялася ўжо сваім продкам. Так дайшлі да прашчура, які стаяў у самым канцы і трымаў вялізную свечку. Ад яе агонь (усе ўдзельнікі загадзя мелі свечкі) стаў перадавацца іншым. З агнём калоны рушылі наперад, пад гукі «Песняроў», паланэза Агінскага. Калі дайшлі да плошчы, спыніліся, склалі свечкі разам і сталі вадзіць карагоды, танчыць... Флэш-моб «Сустрэча з продкамі» сімвалізаваў удзячнасць за жыццё, якое сыходзіла ў глыбіню стагоддзяў.

Усяго, што было на фестывалі, не пералічыць. Сёлета ўпершыню адбыўся начны кінапаказ пад адкрытым небам на падворку музычылішча. А на наступны дзень увечары ладзіўся канцэрт рок-музыкі. Надзвычай прыемнай навіной стаў выхад зборніка «Мы гаворым пра жыццё» з работамі ўдзельнікаў літаратурных намінацый двух мінулых гадоў. Выдавецтва «Зорны верасок» узяло ды і выпусціла дабрачынна кнігу з вершамі і прозай школьнікаў і студэнтаў. А кажуць, дзівосаў не бывае...

Што асабіста я атрымала ад трэцяга фестывалю моладзевых творчых ініцыятыў «Час жыць!»? Па-першае, неверагодна цікавы суботні вечар, шмат новых знаёмстваў з творчымі маладымі людзьмі, якіх, аказваецца, навокал так шмат! Па-другое, зборнік, у якім змяшчаюцца і мае вершы, а ў дадатак пачула песню, напісаную на адзін з іх; гэта навяло на думку: трэба пачынаць больш сур'ёзна ставіцца да ўласнай творчасці?..

Калі свет робіць пагрозлівыя выклікі, можа, не заўсёды трэба змагацца «супраць вайны». Часам варта знайсці тых, хто выступае «за мір», далучыцца і проста крочыць разам...

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Эксперыментальная пляцоўка

АДЧЫНІЦЕ ДЛЯ СЯБЕ «ДЗВЕРЫ»!

Рух «Дзверы» — гэта што? Згуртаванне людзей, якія займаюцца рамонтам дзвярэй? На шчасце, не! «Дзверы» — гэта тэатральны рух, аналагаў якому ў нашай краіне няма. Ці кожны ведае аб новых аматарскіх і альтэрнатыўных тэатрах, у курсе іх афіш і праграм, чуў аб фестывалях і наватарскіх пастаноўках? Рух «Дзверы» — сродак аб'яднання маладых тэатраў Беларусі і спосаб пазнаёміць іх са сваімі гледачамі. Менавіта дзякуючы гэтаму руху акцёр знаходзіць свайго гледача, тэатр — сваю публіку, а спектаклі — сцэну.

Аматарскі тэатр складаецца, зразумела, з акцёраў-аматараў. Рэжысёрамі могуць быць таксама яны самі. Пастаяннай сцэны няма. Аматарскія тэатры незалежныя і ў выбары п'ес, і ў іх вытлумачэнні. Іх выбар не залежыць ад масавага густу. Яны смела эксперыментуюць ва ўсім — няхай гэта будуць дэкарацыі, мова ці касцюмы. Напэўна, таму аматарскія тэатры набываюць усё больш і больш прыхільнікаў.

Але галоўная праблема аматарскіх тэатраў — невядомасць. Яны не маюць бюджэту, каб стварыць рэкламу. Аб іх дзейнасці ведаюць, у асноўным, самі акцёры і іх сябры. Але, вядома, людзі, якія жывуць ідэяй, заўсёды знойдуць рашэнне. Дакладней — ужо знайшлі. Першыя крокі зроблены: да штогадовага фестывалю «Тэатральны Куфар» дадаўся новы незалежны некамерцыйны фестываль аматарскіх тэатраў — «Дзверы».

Гісторыя яго стварэння «нечаканая», як кажуць самі арганізатары. Іх мэтай было стварэнне фестывалю ў імя мастацтва. Ніякай камерцыі. Ніякай фінансавай выгады. Толькі аматарскія тэатры і іх ініцыятыва. У інтэрнэце быў кінуты кліч аб пошуку аднадумцаў. Тэатры ў момант уключыліся ў працу, пастаянна далучаліся людзі, гатовыя аказаць дапамогу.

Прайшоў ужо чацвёрты фестываль «Дзверы». На ім выступілі аматарскія альтэрнатыўныя тэатры не толькі з Мінска, але і з усёй краіны. Галоўнай тэмай была беларуская мова, таму ўсе пастаноўкі праходзілі толькі на ёй.

Зараз «Дзверы» — ужо не проста тэатральны фестываль. Гэта рух, які аб'ядноўвае тэатральную дзейнасць Беларусі. У 2010 годзе выйшаў першы нумар выдання, прысвечанага аматарскім тэатрам, — альманах пад аднайменнай назвай.

А ўвесну адбылася прэзентацыя ўжо сёмага выпуску альманаха. Тэмай нумара быў пластычны тэатр. Арганізатары зладзілі гледачам сюрпрыз: перад імі выступіў адэкватны тэатр «вКубе» з пластычнай пастаноўкай «Стварэнне свету», і кожны мог паспрабаваць свае сілы ў фатаграфіі.

...Аматарскія тэатры працягваюць працу над новымі пастаноўкамі. У іх з'яўляюцца новыя пляцоўкі для выступленняў. Павялічваецца колькасць гледачоў і проста зацікаўленых тэатрам людзей. Вялікія планы на будучыню, мэтанакіраванасць і інтарэс — адметныя рысы такога яшчэ маладога, але ўжо масавага руху «Дзверы». Эксперыменты, наватарскія рэжысёрскія пастаноўкі, незалежнасць, энтузіязм акцёраў-аматараў... Усё гэта дазваляе акунуцца ў незабыўны свет тэатра, адчуць яго знутры, слухаць і ўзаемадзейнічаць з ім.

Анастасія РАГАЧОВА,
выпускніца гімназіі №174
г. Мінска.

ПЛАН ПРИЕМА ЛИЦ ДЛЯ ПОЛУЧЕНИЯ ПОСЛЕВУЗОВСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ НА 2013 ГОД ЗА СЧЕТ СРЕДСТВ РЕСПУБЛИКАНСКОГО БЮДЖЕТА

Организация-исполнитель	Организация-заказчик/ сторонний заказчик	Шифр специальности	Аспирантура				Докторантура		
			Всего	Из них по форме обучения			Всего	Из них по форме обучения	
				Дневная	Заочная	Соискательство		Дневная	Соискательство
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
УО «Гомельский государственный медицинский университет»	РНПЦ «РМиЭЧ»	14.01.05 — кардиология	3	-	1	-			
	УО «Гомельский государственный медицинский университет»				1	1			
УО «Гомельский государственный медицинский университет»	УО «Гомельский государственный медицинский университет»	14.03.02 — патологическая анатомия	2	-	-	2			
УО «Гомельский государственный медицинский университет»	УО «Гомельский государственный медицинский университет»	14.03.09 — клиническая иммунология, аллергология	1	1	-	-			
УО «Гомельский государственный медицинский университет»	УО «Гомельский государственный медицинский университет»	03.03.01 — физиология	1	-	-	1			
УО «Гомельский государственный медицинский университет»	УО «Гомельский государственный медицинский университет»	14.01.15 — травматология и ортопедия	1	-	-	1			
УО «Гомельский государственный медицинский университет»	УО «Гомельский государственный медицинский университет»	14.03.01 — анатомия человека	1	-	-	1			
УО «Гомельский государственный медицинский университет»			9	1	2	6			

УНП 400022681

Белорусская государственная сельскохозяйственная академия
ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ В 2013 ГОДУ

ОЧНАЯ ФОРМА ОБУЧЕНИЯ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ:

УНП 700077852

	Чел.		Чел.
Агрохимия	2	Технологии и средства механизации сельского хозяйства	2
Бухгалтерский учет, статистика	1	Кормление сельскохозяйственных животных и технология кормов	1
Мелиорация, рекультивация и охрана земель	3	Частная зоотехния, технология производства продуктов животноводства	1
Разведение, селекция и генетика сельскохозяйственных животных	1	Рыбное хозяйство и аквакультура	1
Селекция и семеноводство	3	Экономика и управление народным хозяйством	5
Растениеводство	1	Геодезия	1

ЗАОЧНАЯ ФОРМА ОБУЧЕНИЯ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТЯМ:

	Чел.		Чел.
Бухгалтерский учет, статистика	2	Экономика и управление народным хозяйством	1

В аспирантуру на конкурсной основе принимаются лица, имеющие высшее образование, за исключением высшего образования I ступени; склонность к научным исследованиям; рекомендацию совета факультета (для поступающих в год окончания обучения в данном учреждении) либо опыт практической работы не менее двух лет на должностях, требующих наличия высшего образования.

Поступающие в аспирантуру для получения научной квалификации «Исследователь» должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления в аспирантуру.

Для поступления в аспирантуру необходимо подать:

1. Заявление на имя ректора академии по установленной форме.
2. Личный листок по учету кадров.
3. Автобиография.
4. Копии диплома о высшем образовании и прилагаемой к нему выписки из зачетно-экзаменационной ведомости.
5. Копии диплома магистра и прилагаемой к нему выписки из зачетно-экзаменационной ведомости (при наличии).
6. Копия удостоверения о сдаче кандидатских экзаменов и зачетов по общеобразовательным дисциплинам.
7. Копия трудовой книжки или рекомендация совета факультета учреждения образования (для поступающих в год окончания обучения в данном учреждении).
8. Список и копии опубликованных научных работ, а при их отсутствии — научный реферат по профилю избранной специальности.
9. Три фотографии размером 4х6 см.
10. Медицинская справка о состоянии здоровья по форме, установленной Министерством здравоохранения.

Паспорт и подлинники дипломов предъявляются лично.

Прием документов с 1 августа по 30 сентября 2013 года.

Поступающие в аспирантуру сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине в объеме действующей программы для студентов вузов. **Прием вступительного экзамена с 15 по 18 октября 2013 года.**

Наш адрес: **213407, отдел аспирантуры БГСХА, ул. Мичурина, 5, г. Горки, Могилевская область, тел. 796 59.**

УНП 100235722

БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ

для получения послевузовского образования в аспирантуре (дневной, заочной и в форме соискательства) и докторантуре (дневной и в форме соискательства)

Лица, поступающие в аспирантуру для обучения в дневной или заочной форме получения образования, сдают вступительный экзамен по специальной дисциплине в объеме учебной программы I ступени высшего образования. Кандидатские экзамены и зачет по общеобразовательным дисциплинам должны быть сданы до поступления в аспирантуру.

Для получения послевузовского образования в аспирантуре в форме соискательства сдача вступительного экзамена не требуется.

Подробная информация по правилам приема на сайте БГУ (http://www.bsu.by) или по тел.: 209-51-73, 209-50-24, 209-54-23.

Прием документов осуществляется с 1 августа по 30 сентября 2013 года по адресу: г. Минск, ул. Бобруйская, 9, к. 420, отдел аспирантуры и докторантуры БГУ.

План приема лиц для получения послевузовского образования на 2013 год в Белорусском государственном университете

Организация-заказчик	Шифр специальности	Аспирантура				Докторантура		
		Всего	Из них по форме получения образования			Всего	Из них по форме получения образования	
			Дневная	Заочная	Соискательство		Дневная	Соискательство
2	3	4	5	6	7	8	9	10
Брестский государственный университет им. А.С. Пушкина	01.01.01	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.01.01	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.01.02	3	2		1	0		
Белорусский государственный педагогический университет им. Максима Танка	01.01.04	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.01.07	2	2			0		
Организация-исполнитель	01.01.09	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.02.04	2	2			0		
Организация-исполнитель	01.04.02	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.04.03	2	2			0		
Организация-исполнитель	01.04.04	4	4			0		
Организация-исполнитель	01.04.05	4	3	1		0		
Брестский государственный университет им. А.С. Пушкина	01.04.07	0				1	1	
Брестский государственный университет им. А.С. Пушкина	01.04.10	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.04.10	1	1			0		
Организация-исполнитель	01.04.16	1	1			0		
Организация-исполнитель	02.00.01	1	1			0		
Организация-исполнитель	02.00.02	2	1		1	0		
ГУ «Республиканский научно-практический центр гигиены» Министерство здравоохранения Республики Беларусь	02.00.02	1			1	0		
Минский НИИ радиоматериалов, Государственный военно-промышленный комитет Республики Беларусь	02.00.04	1		1		0		
Организация-исполнитель	02.00.04	3	3			0		
Организация-исполнитель	02.00.21	2	2			0		
Организация-исполнитель	03.01.02	2	2			0		
Организация-исполнитель	03.01.04	2	2			0		
Организация-исполнитель	03.01.05	1	1			0		
Брестский государственный университет им. А.С. Пушкина	03.01.05	1		1		0		
Организация-исполнитель	03.02.01	2	2			0		
Организация-исполнитель	03.02.03	2	2			0		
Организация-исполнитель	03.02.04	2	2			0		
Витебский государственный университет им. П.М. Машерова	03.02.04	0				1	1	
Организация-исполнитель	03.02.05	2	2			0		
Организация-исполнитель	03.02.07	1	1			0		
ГНУ «Физико-технический институт НАН Беларуси», Национальная академия наук Беларуси	05.13.01	1		1		0		
Организация-исполнитель	05.13.01	2	2			0		
Организация-исполнитель	05.13.17	1	1			0		
Организация-исполнитель	05.13.18	1	1			0		
Организация-исполнитель	05.13.19	1	1			0		
Организация-исполнитель	05.25.02	3	1	2		0		
Организация-исполнитель	05.27.01	2	2			0		
Полоцкий государственный университет	07.00.02	1			1	0		
Витебский государственный ордена Дружбы народов медицинский университет, Министерство здравоохранения Республики Беларусь	07.00.02	1		1		0		
Институт национальной безопасности, Комитет государственной безопасности Республики Беларусь	07.00.02	1		1		0		
Министерство внутренних дел Республики Беларусь	07.00.02	1		1		0		
Организация-исполнитель	07.00.02	3	3			0		
Организация-исполнитель	07.00.03	4	3	1		0		
Гомельский государственный университет им. Франциска Скорины	07.00.03	1	1			0		
Отдел культуры Светлогорского райисполкома, Управление культуры Гомельского облисполкома	07.00.06	1	1			0		
Организация-исполнитель	07.00.06	1	1			0		
Организация-исполнитель	07.00.07	2	1	1		0		
Организация-исполнитель	07.00.09	2	1	1		0		
Организация-исполнитель	07.00.15	5	5			1	1	
Военная академия Республики Беларусь, Вооруженные силы Республики Беларусь	07.00.15	1		1		0		
Организация-исполнитель	08.00.01	3	2	1		0		
Полоцкий государственный университет	08.00.01	1		1		0		
Брестский государственный университет им. А.С. Пушкина	08.00.05	1		1		0		
Барановичский государственный университет	08.00.05	1	1			0		
Организация-исполнитель	08.00.05	4	3		1	0		
Институт бизнеса и менеджмента технологий БГУ	08.00.05	4	1	1	2	0		
Организация-исполнитель	08.00.13	3	1	1	1	0		
Организация-исполнитель	08.00.14	2	1	1		0		
Организация-исполнитель	09.00.03	1			1	0		
Военная академия Республики Беларусь, Вооруженные силы Республики Беларусь	09.00.03	0				1		1
Организация-исполнитель	09.00.11	1		1		0		
Организация-исполнитель	09.00.14	1	1			0		
Организация-исполнитель	10.01.01	1			1	0		
Организация-исполнитель	10.01.03	2	2			0		
Организация-исполнитель	10.01.08	2			2	0		
Организация-исполнитель	10.01.10	5	4		1	0		
Белорусский государственный аграрный технический университет, Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь	10.02.01	1	1			0		
Организация-исполнитель	10.02.01	2	2			0		
Республиканский институт контроля знаний	10.02.01	1			1	0		
Белорусский государственный университет культуры и искусств, Министерство культуры Республики Беларусь	10.02.01	0				1	1	
Организация-исполнитель	10.02.02	3		2	1	0		
Издательское республиканское унитарное предприятие «Народная асвета», Министерство информации Республики Беларусь	10.02.02	1		1		0		
Организация-исполнитель	10.02.19	5	3	1	1	0		
Могилевский государственный университет им. А.А. Кулешова	10.02.19	1	1			0		
Витебский государственный медицинский университет, Министерство здравоохранения Республики Беларусь	10.02.19	1		1		0		
Витебский государственный университет им. П.М. Машерова	10.02.19	1	1			0		
Полоцкий государственный университет	10.02.19	1		1		0		
Организация-исполнитель	10.02.20	2	2			0		
Гродненский государственный университет им. Янки Купалы	10.02.21	1		1		0		
Организация-исполнитель	10.02.22	1	1			0		
Национальный центр правовой информации Республики Беларусь, Администрация Президента Республики Беларусь	12.00.01	1	1			0		
Организация-исполнитель	12.00.01	1	1			1		1
Полоцкий государственный университет	12.00.02	1	1			0		
Организация-исполнитель	12.00.02	2	1	1		0		
Национальный центр законодательства и правовых исследований Республики Беларусь, Администрация Президента Республики Беларусь	12.00.02	0				1		1
Полоцкий государственный университет	12.00.03	1			1	0		
Организация-исполнитель	12.00.03	3	2	1		0		
Организация-исполнитель	12.00.04	2	1	1		0		
Организация-исполнитель	12.00.05	1	1			0		
Полоцкий государственный университет	12.00.06	1		1		0		
Организация-исполнитель	12.00.06	2	1	1		0		
Белорусский торгово-экономический университет потребительской кооперации, Белорусский республиканский союз потребительских обществ	12.00.08	1		1		0		
Организация-исполнитель	12.00.10	3		2	1	0		
Государственный таможенный комитет Республики Беларусь	12.00.13	1	1			0		
Организация-исполнитель	12.00.15	1		1		0		
Витебский государственный университет им. П.М. Машерова	12.00.15	1		1		0		
Организация-исполнитель	13.00.01	1			1	0		
Военная академия Республики Беларусь, Вооруженные силы Республики Беларусь	13.00.01	1		1		0		
Гродненский государственный университет им. Янки Купалы	19.00.01	1		1		0		
Витебский государственный университет им. П.М. Машерова	19.00.05	0				1		1
Полоцкий государственный университет	19.00.05	1			1	0		
Организация-исполнитель	19.00.05	1	1			0		
Организация-исполнитель	19.00.07	2	1	1		0		
Организация-исполнитель	22.00.01	1	1			0		
Организация-исполнитель	22.00.08	1	1			0		
Организация-исполнитель	23.00.01	2	2			0		
Организация-исполнитель	23.00.02	1			1	0		
Витебский государственный университет им. П.М. Машерова	23.00.02	1		1		0		
Организация-исполнитель	24.00.01	2	1		1	0		
Министерство внутренних дел Республики Беларусь	24.00.01	1		1		0		
Организация-исполнитель	24.00.03	1	1			0		
Организация-исполнитель	25.03.01	2	2			0		
Организация-исполнитель	25.03.02	2	2			0		
Организация-исполнитель	25.03.13	1	1			0		
Итого		**182**	**118**	**42**	**22**	**8**	**4**	**4**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
27 06 2013 г.

Новая аповесць Андрэя Федарэнкі — прыемны сюрпрыз чытачам «Маладосці», якія паспеюць аформіць падпіску на другое паўгоддзе. Насычаная характарамі «Ціша» друкуецца ў ліпеньскім нумары разам з іншымі досыць прывабнымі творамі — апавяданнямі Сяргея Маціна, Маргарыты Прохар, Кірыла Стаселькі і дэбютанта Канстанціна Касяка. Забягаючы наперад, варта адзначыць, што да канца года «Маладосць» плануе прадставіць свайму чытачу даволі яркую і важкую прозу Святланы Бязлепкінай (сачыце за з'яўленнем «Лініі Дзюранда»), Уладзіміра Мажылоўскага (не прапусціце «Друеўскага ваўкалака»!), Аляксандра Вашчанкі («Rock forever, або Чатыры падарожжы ў мінулае»), Валерыя Гапеева, Зінаіды Дудзюк, Міхася Зізюка, Алеся Аляшкевіча, Віктара Супрунчука, а таксама «малыя формы» Валерыі Саротнік, Яўгена Мартыновіча, Генадзя Аўласенкі, Маргарыты Аляшкевіч, Івана Стадольніка.

Дарэчы, у сувязі са сваім юбілеем часопіс дорыць паўгадавым падпісчыкам рарытэтныя экзэмпляры 1950-х гадоў з пажаданнямі і аўтографамі вядомых пісьменнікаў нашага часу. Лозунг у «Маладосці» нязменны: «Чытайце беларускае!»

Андрэй ФЕДАРЭНКА (Урывак з аповесці)

ЦІША

І гэты авальны маршрут аўтобуса, і ўсё, што знаходзілася ўсярэдзіне авала: ціхая, дачная Слабада са сваімі студнямі і пеўнямі, домікі, садзікі, агароды, дарога, лес, поле, краявід горада, і рачулка, якая таксама акружала Слабаду, нібы акальцоўвала яе, — усё было надзвычай талкова прадумана некім. А яшчэ стварала адчуванне ўтульнасці і бяспекі.

Нават тое, што бацька не жыве з імі, амаль не бывае дома, мала бянтэжыла Петрыка. Яму і так някепска жылося. Маці з бабуляй любілі яго, песцілі. Паміж сабой — у адрозненне ад Домніных сыноў — амаль ніколі не сварыліся. Домна звала нявестку «доня», а нявестка яе — «мама» і на «вы». Хіба што зрэдку, калі маці прыходзіла з парнікоў асабліва натомленая, а баба Домна, наадварот, кулікнуўшы пару чарачак «абрыкосавай», была ў прыўзнятым настроі, нявестка магла адпусціць на адрас свякрухі пару з'едлівых — кшталту: «Пры жывым мужы быць саламянай удавой... Усе сем'і як сем'і, а мой — капітан...»

Звычайна бабуля вінавата адмоўчвалася. Толькі прасіла ціха:

— Не сварыся, донечка...

— Я не сварыся, мама! Я проста так кажу! Былі б грошы — не было б клопату...

Ужо гэтыя грошы! З чаго б маці ні пачынала, абавязкова на іх збівалася. Яна нібы проста так, сама сабе, як бы паміж іншым пачынала ўпікаць бабу Домну, што тая — удава героя вайны, жонка загінулага франтавіка, вось цэлых адзінаццаць гадоў не хоча атрымліваць законную грашовую дапамогу, гэтак званыя «ўдовіныя».

— Гэта ж столькі грошай ляснула — падумаць страшна!

І ўсё з-за драбязы (лічыла маці), ад гонару, звычайнага капрызу. Начальства ўсяго толькі хацела перанесці прах Андрэя з слабадскіх могілак у брацкую магілу каля аэрадрома, а Домна не давала дазволу. Прычым у такой рэзкай форме, што начальству хоць вушы затыкай.

— Адступіцеся! Я не ведаю, каго вы там у вашай братняй магіле пазбіралі ды пазакопвалі!

— Не ў нашай, — цярпліва папраўлялі яе. — Не наша яна, а агульная. Гэта народны сімвал.

— Хай сімвал, а я дазволу не даю!

— Ды зразумей ты: мы ж не для сябе — для цябе стараемся, табе дабра хочам, і твайму Андрэю...

— Ён мне не кажа, што яму там кепска!

— Ну падумай сама — школьнікаў куды вадзіць на 9 мая? На могілкі? Дзяцей у піянеры прымаць — перад дубовым крыжам?

— Вадзіце куды хочаце.

— ...А брацкая магіла — гэта ж прыгожа, велічна, культурна... Здалёк відаць. Чыста прыбрана, літары золатам напісаныя...

— Хай золатам, хай серабром, а я дазволу не даю. Вам трэба, дык выкопвайце — я рыдлёўку пазычу.

— Глядзі, дажартуешся! — намякалі ёй. — Табе трэба ўвогуле маўчаць, бо, калі на тое пайшло, з гэтай гісторыяй трэба яшчэ разабрацца...

Гісторыя і праўда была няпростая; усяго ў ёй было намешана: супадзенне, неверагоднасць, збег абставін і нават крыху містыкі. Ад першага дня вайны радавы Андрэй, як і ўсе, ваяваў — у сэнсе, адступаў, быў у акружэнні пад Смаленскам, удзельнічаў у абароне Масквы, а ў 43-м, калі вызвалялі Беларусь, так супала, што акурат іхняй дывізіі выпаў гонар ачышчаць ад немцаў родны горад і сваю Чэшскую Слабаду... Як угледзеў салдат знаёмыя краявіды, як забілася сэрца, — так і пабег, не хаваючыся ад куль, што свісталі над галавою, па сваёй вуліцы, ускочыў у двор, прытуліўся да абрыкосавага дрэва... І асеў... Сэрца не вытрымала! Так і памёр на месцы. Аднапалчане, сцягнуўшы пілоткі, пастаялі крыху, паслухалі, як галосіць над нядаўнім іхнім жывым таварышам, а цяпер нябожчыкам, маладзіца-ўдава... Вайна ёсць вайна, яшчэ не такое здараецца, не рэдкасцю было, калі чалавек сярод франтавой віхуры паміраў сваёй смерцю... Але каб вось так, на ганку роднага дома!.. Крышку пастаялі — і далей, трэба было працягваць наступленне, не даваць немцам апамятацца; вызвалены маленькі горад з ваколіцамі быў усяго толькі нязначным эпізодам у грандыёзнай аперацыі. А салдат застаўся ляжаць у роднай зямельцы на мясцовых могілках пад дубовым крыжам. Калі неўзабаве ўзнавіў працу ваенкамат, Домну адну з першых выклікалі туды. Вярнулася жанчына з цэлым багаццем: згушчонка, тушонка, хлеб, селядцы, павідла, а галоўнае, з новенькімі дакументамі, у якіх рашучая пячатка пацвярджала, што яе муж сапраўды «геаічна загінуў пры вызваленні Чэшскай Слабады», і цяпер яна афіцыйна з'яўляецца ўдавой франтавіка. Неўзабаве аформілі прадуктовыя карткі на дзяцей, потым пенсію, ільготы — усё як належыць, і нават пазней, у сувязі з 10-годдзем, 20-годдзем заканчэння вайны ці проста на 9 мая яшчэ выклікалі ў гарсабес і ўручалі розныя каштоўныя падарункі або грашовую невялічкую дапамогу. Недзе ў 60-я, калі ўзнікла мода на манументы, брацкія магілы, абеліскі, пастаменты з бетонным салдатам у касцы і партызанам з гранатай, у Слабадзе таксама заварушыліся, выбралі месца — каля аэрадрома, на высокім пагорку, каб здалёк было відаць, і вырашылі перазахаваць астанкі партызан і падпольшчыкаў у агульную магілу, а над ёй узвесці стандартны мамумент. Вось тут Домна нечакана праявіла ўпартасць: «Не даю дазволу! Ён ляжыць і есці не просіць».

Начальства ўсіх калібраў: слабадское, гарадское, ваенкаматаўскае, з аддзела культуры і ідэалогіі, з райсабеса — спачатку нават разгубілася. Гэтая Домна проста збіла іх з панталыку, пераблытала планы, паставіла ў няёмкае становішча. Ды яшчэ і ўзнік нейкі ледзь не палітычны аспект, двухсэнсоўнасць, рэлігія — карацей, чорт ведае што.

Спачатку Домну ўпрошвалі. Потым пачалі злавацца, папярэджваць, пагражаць.

— Глядзі! Бо калі на тое пайшло, мы ўміг дакажам, што ён ніякі не герой, а проста памёр сваёй смерцю, без удзелу ў баявых дзеяннях. Каб ён хоць прапаў без вестак, ці хоць сваёй смерцю памёр, але дзесь далёка, не на вачах, і каб пахаваны быў таксама далёка — тады б яшчэ мог лічыцца героем. А так? Па сутнасці? Калі разабрацца? Ні тое, ні сёе, нейкая несуразная смерць... Ужо дакладна — не подзвіг.

А Домна заладзіла сваё:

— Адступіцеся! Па дакументах ён франтавік-герой. Вы мне самі дакументы выправілі!

— Як выправілі, так і анулюем. Дакументы і ануляваць можна.

— Ануліруйце! Як у вас сумлення няма...

Любому цярпенню, нават начальніцкаму, прыходзіць канец. Як ты з намі, так і мы з табою. Калі ў цябе прынцыпы, дык у нас тым больш. Сказана — зроблена. Узялі і сапраўды пазбавілі пенсіі, ільгот — словам, усяго.

— Ануліравана! Цяпер ты не ўдава героя вайны, — цынічна заявілі ёй. — Больш не будзе табе ні грошай, ні льгот, яшчэ і медалі забяром.

— Забірайце! Сабе начапляйце ды насіце! Не трэба мне вашы медалі і вашы грошы — абы вы сябе не абдзялілі!

— І яшчэ прымусім вярнуць за ўсе гады, што ты несправядліва атрымлівала. І тушонку вернеш...

— Грошы я на дзяцей траціла, а тушонку куплю — ешце! Хай вашы дзеці так наядзяцца мяса, як мае! — дзёрзка адказвала ганарыстая, непакорная ўдава.

Тым больш што дзеці ў яе да таго часу павырасталі, а Стах і Стэфан дык нават паспелі адслужыць і ажаніцца.

Але ў душы, канечне ж, перажывала. Людзі бачылі несправядлівасць, спачувалі ёй, раілі:

— Напішы ў Маскву.

— Не буду я пісаць ні ў Маскву, ні ў Берлін! Хіба ён вінаваты, што загінуў не так, як ім хочацца?

Уся гэтая гісторыя пачалася даўно, калі Марк яшчэ не быў жанаты, а Петрыка нават на свеце не было, цягнулася вось ужо цэлых адзінаццаць гадоў і перыядычна не давала маці спакою.

— Адзінаццаць... ці то ўжо больш, на дванаццаць месяцаў, — пачынала множыць маці, збівалася. — Ды павышэнні кожны год... Кватэру, палац можна было б адбудаваць! Каб хаця палавіну тых грошай — і Марку не трэба было б у заробкі ездзіць, гібець у той Сібіры... Даўно б у мікрараёне жылі... Ці хаця б Петрыку вунь адкладвалі... А так — абы-што!

— Не ўбівайся, донечка... Гэта не тыя грошы, якіх шкадаваць трэба.

— Дык крыўдна ж вельмі, несправядліва! Можа, варта было б саступіць? Хай бы перазахавалі... Цела мёртвае, а грошы ж жывыя. Мо і цяпер не позна, калі б вы саступілі, дык і яны за ўсе гады разлічыліся б...

Бабуля Домна падціскала вусны і ўпарта маўчала. Ды і маці казала ўжо без энтузіязму. Яна як хутка загаралася, так і астывала, і ў канцы рабілася поўнай саюзніцай бабы Домны; ужо ёй самой было няёмка, што лішні раз развярэдзіла сямейную драму.

Выліўшы душу, выказаўшыся, яна зараз жа пачынала шкадаваць, апраўдваць свякруху і вінаваціла ўжо не Домну, а «тых» — маўляў, хоць бы, бессаромнікі, ільготы пакінулі: зубы паставіць, за электрычнасць менш плаціць, у транспарце бясплатна ездзіць, у чарзе не стаяць, ну, мала што.

І канчалася ўсё аднолькава — скрушнымі жаночымі ўздыхамі і цвёрдым перакананнем:

— Няма справядлівасці на гэтым свеце!

Сапраўдны скарб

НЕ ЦУРАЙЦЕСЯ Ж МОВЫ СВАЁЙ!..

У суседні з маім дом пераязджала сталая пара. На скрынях, якія цягалі на трэці паверх рабочыя, усе надпісы былі зроблены па-беларуску: «фіранкі», «крышталь», «паркалёвыя рэчы». Новыя жыхары і паміж сабой размаўлялі па-беларуску. Мова іх лілася павольна, без напружання, якое звычайна ўзнікае, калі ў чалавека не хапае слоўнікавага запасу. Суседзі глядзелі на пару, як на цуд нейкі: пачуць родную мову на вуліцы даводзіцца вельмі рэдка. Тым больш прыгожую, не трасянку.

На жаль, гэта сапраўды так. Знаёмыя маёй сям'і аднойчы вырашылі адзначыць дзень нараджэння дачкі па-за сценамі ўласнай кватэры. І паколькі дома яны размаўляюць выключна на роднай мове, месцам для свята была абрана ўстанова культуры, дзе для дзяцей праводзяцца экскурсіі па-беларуску. Аднак, акрамя экскурсій (а ў праграму ўваходзілі таксама і гульні, і віншаванні) на роднай мове не было сказана ніводнага слова.

Калі бацькі спыталіся чаму, ім адказалі, што людзі, якія праводзяць гульні, беларускай мовай... не валодаюць! Як такое магло адбыцца? Здавалася б, беларуская мова мае статус дзяржаўнай, яе абавязкова вывучаюць у школах, існуюць нават беларускамоўныя класы, у дзіцячых садках — групы. Дык у якіх прасторах растваряюцца людзі, якія чыталі на ўроках пра Лабановіча і Міколку-паравоза, вучылі на памяць вершы Багдановіча і Танка? Няўжо родныя словы імгненна знікаюць з памяці?

Думаю, у памяці яны ўсё ж застаюцца. Але многія іх чамусьці цураюцца. Майму знаёмаму неяк давялося звярнуцца ў мінскае атэлье, што займаецца вышываннем нацыянальных касцюмаў. Тут працуюць з многімі народнымі калектывамі, каб зрабіць вышыванкі на сукенках і кашулях. Аднак, калі мой знаёмы патэлефанаваў ім і пачаў размову па-беларуску, яго проста... зняважылі. Маўляў, няма чаго вылузвацца, нешта незразумелае мармытаць, кажыце па-людску! Вось вам і зварот да вытокаў. Аднак дзеля справядлівасці ўсё ж дадам, што, калі мой знаёмы прыйшоў у гэтае атэлье, размаўлялі з ім ветліва і ўжо выключна па-беларуску.

Складваецца ўражанне, што многія сароме-юцца размаўляць на роднай мове. Аднак мне здаецца, што саромецца трэба зусім не гэтага, а наадварот — таго, што не ведаеш і не шануеш сваю культуру, гісторыю, свой нацыянальны скарб, якім і з'яўляецца беларуская мова.

Ганна КУЛАКЕВІЧ,
выпускніца СШ № 163 г. Мінска.

Мой свет

КАЛІ ВЯСЁЛКА ЎСМІХАЕЦЦА...

Чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, блакітны, сіні, фіялетавы... Мільгацяць колеры, быццам спрабуюць размаляваць увесь свет. Вясёлка ўсміхнулася. Яна ў вачах, калі я адчуваю яго побач. Выпадковыя, сустрэчы. І мне здаецца, што іх перыядычнасць узрастае з геаметрычнай прагрэсіяй.

Публічнае выступленне з творам. Хваляванне. Зайздрошчу тым, хто ўмее стрымліваць яго і ўмее перадаваць эмоцыі мастацкіх твораў, ад якіх не толькі мурашкі па спіне, але і вясёлка ў вачах з'яўляецца. Такіх няшмат. Адзінкі. Творчыя людзі звычайна сустракаюцца на розных мерапрыемствах, якія нейкім чынам звязаны з іх захапленнем. У такой атмасферы, хутчэй за ўсё, можна схапіць натхненне за «хвост» і паспрабаваць на некалькі хвілін утрымаць яго...

У той дзень атрымалася злавіць вясёлку. Калі пачаў спяваць Арцём, усе мае думкі адышлі на другі план, захапіла з першай ноты. Імгненна ўзнікла жаданне, каб песня доўжылася бясконца.

Праз нейкі час адборачны тур на другі конкурс. За кулісамі чакаем сваёй чаргі, каб выйсці на сцэну. Крок. Другі. Трэці. Разварот. Крок. Другі. Трэці. Разварот. Спатыкаюся і ледзь не збіваю маладога чалавека.

— Прабачце, калі ласка! — паднімаю вочы, і... вясёлка з'яўляецца ў іх. Гэта быў той самы Арцём. Выпадковасць.

Аднак не дзіўна. Імкненне прадэманстраваць свае таленты на конкурсах — звычайная з'ява для вакалістаў-пачаткоўцаў. Вопыт, ён у любой справе патрэбен. На сцэне з мікрафонам у руках неабходна быць як рыба ў вадзе. Хваляванне ўзрастае. Я зноў пачую яго чароўны голас. І як, скажыце, пасля мурашак і вясёлкі выйсці на тую ж самую сцэну?..

Аўдыторыя 123. Адчыняю дзверы... Чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, блакітны, сіні, фіялетавы. Не веру сваім вачам. Не выпадковасць, ужо заканамернасць. Сярод абітурыентаў Арцём. Тое, што ў нас аднолькавы выбар будучай прафесіі, дадало мне ўпэўненасці — я на правільным шляху.

Кацярына ЛЯСУН.

Тэорыя поспеху

НАТХНЯЮЧЫСЯ ЎСІМ НАВОКАЛ

Чалавек, улюбёны ў сваю справу.

Юлія Разнічэнка з тых людзей, пра якіх кажуць: «У яе ёсць стрыжань». Дзяўчына — стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, фіналіст рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года» і пераможца ў дадатковай намінацыі «Студэнт года online».

МАЛЕНЬКІМІ КРОКАМІ...

— Калі я паступіла на першы курс у БДУІР, у мяне была мара атрымаць стыпендыю спецыяльнага фонду Прэзідэнта і трапіць на прэзідэнцкі баль выпускнікоў. Спачатку гэта падавалася вельмі складаным. Але пакрысе, маленькімі крокамі ўсё атрымалася. Трэба было два гады добра вучыцца, займацца грамадскай і навуковай дзейнасцю, праяўляць сябе. Пацвярджаць права на стыпендыю кожныя паўгода. Гэта давала стымул не спыняцца, распрацоўваць новыя ідэі.

Усе праекты, якія я паспела рэалізаваць за час навучання, звязаны паміж сабой. Напачатку стала арганізатарам, а пасля і кіраўніком клуба дэбатаў на англійскай мове, які існаваў на нашым факультэце. Мы запрашалі туды студэнтаў, і яны маглі падтрымліваць гутарковыя навыкі англійскай мовы і, разам з тым, абмяркоўваць цікавыя тэмы. Дзякуючы моўнай практыцы, якую мы ўдасканальвалі ў клубе, спрасцілася супрацоўніцтва са студэнтамі з Нігерыі. Яны — музыканты, уваходзяць у склад нашага ўніверсітэцкага джаз-бэнда, салісткай якога я з'яўлялася. Сам джаз-бэнд дапамог рэалізаваць сябе не толькі ў творчасці, але і ў навуцы. Я распрацавала двухгадовы маркетынгавы даследчыцкі праект брэндынгу джаз-бэнда. Ён быў паспяхова рэалізаваны на практыцы, і ў многім дзякуючы гэтаму мы атрымалі перамогу на рэспубліканскім конкурсе «Арт-канікулы». Згаданыя праекты, разам з яшчэ адным распрацаваным мерапрыемствам спартыўна-агітацыйнай накіраванасці, я ў комплексе прадставіла на конкурсе «Студэнт года».

Прэтэндэнтаў на перамогу нават у нашым універсітэце было шмат. Таму паміж намі разгарнулася сур'ёзная барацьба. Выйграць яе было нялёгка. А ў фінале гаворка ішла ўжо аб іміджы БДУІР на рэспубліканскім узроўні. Мне перамагчы дапамог, напэўна, творчы запал.

НЕ СПЫНЯЦЦА

— Ужо некалькі месяцаў я працую па сваёй спецыяльнасці. Прычым прапанова паступіла яшчэ да атрымання дыплома. Праекту патрэбны быў маркетолаг, які разбіраецца ў спецыфіцы інтэрнэт-маркетынгу — гэта мая спецыялізацыя і тэма дыпломнай работы, якую атрымалася абараніць на «выдатна» (мы сустрэліся з Юліяй праз некалькі дзён пасля абароны. — **Аўт.**). Цяпер я збіраюся паступаць у магістратуру па спецыяльнасці «Менеджмент», каб пашырыць кругагляд і атрымаць больш прафесійных навыкаў. Усё гэта звязана з маёй прафесіяй, таму я не збіраюся спыняцца на дасягнутым. Апроч таго, у кампаніі, дзе я працую, вельмі вялікую ўвагу надаюць навучанню супрацоўнікаў. Я пастаянна вучуся чамусьці новаму ў калег, таму я не сказала б, што на студэнцтве мая вучоба скончылася.

РЭАЛІЗАВАЦЬ СЯБЕ ВА ЎСІМ

— Мне падаецца, гэта памкненне чалавека — рэалізаваць сябе ва ўсіх кірунках. Не трэба спыняцца на чымсьці адным, трэба шукаць сябе паўсюль. «Зацыкліванне» на адным кірунку вельмі абмяжоўвае кругагляд і не дазваляе цалкам рэалізоўваць свой патэнцыял.

Як не разгубіцца і не стаміцца ад няўдач? Ёсць такая прымаўка: «Хто не ідзе — той не спатыкаецца». З усяго, што робіш, трэба выносіць урокі, і, калі нешта раптам не атрымалася, ні ў якім разе не трэба думаць, што гэта «паталогія» *(смяецца)*.

«ЛЮБІ ТОЕ, ШТО РОБІШ, І РАБІ ТОЕ, ШТО ЛЮБІШ»

— Што мяне натхняе?.. Усё навокал! *(усміхаецца)*.

Я люблю марыць, люблю сустракацца са сваімі сябрамі і сваякамі. Вельмі люблю сваю працу, там шмат цікавых праектаў. Гэта для мяне як хобі, мне ў радасць гэтым займацца. Мне падабалася мая вучоба. Натхненне — у навакольлі: у тым, што адбываецца, у тым, што бачу. Трэба шукаць прыгажосць ва ўсім.

У дзяцінстве былі разнастайныя мары. Хацела стаць дызайнерам, праграмістам, спявачкай. Але ў маленстве, калі марыш аб сваёй будучай прафесіі, ты яшчэ не можаш зразумець, што ў цябе атрымаецца, а што не. Мне ў гэтым вельмі дапамагала мама, педагогі ў школе. Яны стараліся развіваць усё, да чаго ў мяне ўзнікаў інтарэс. І атрымалася, што, стаўшы маркетолагам, я змагла рэалізаваць усе свае дзіцячыя і юнацкія мары, атрымала цікавую прафесію, звязаную і з навукай, і з творчасцю. Ёсць такі выраз: «Знайдзіце справу па душы — і вам не давядзецца працаваць ніводнага дня». Таму на працу кожны дзень хаджу як на свята. Словам, любі тое, што робіш, і рабі тое, што любіш.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

Усё «ОК!»

МУЖ І ЖОНКА — СТУДЭНЦКАЯ СУПОЛКА

Пакуль невядома, хто стане пераможцам...

Сужэнцы адказваюць на адно і тое ж пытанне па-рознаму, а дэтэктар хлусні сцвярджае, што абодва гавораць праўду... Ці можа такое здарыцца? Альбо навошта мужу апранаць адзенне сваёй жонкі і ісці чысціць бульбу, пакуль каханая ў яго кіцелі пайшла па справах? Адказы на гэтыя пытанні ўдалося атрымаць у Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ў Мінску, дзе нядаўна сярод васьмі пар вызначылі лепшую студэнцкую сям'ю Беларусі і дзе гледачам давялося пабачыць усе вышэйзгаданыя праявы «сямейнага жыцця»...

Каб прадставіць гледачам «візітную картку» сваёй сям'і, пары што толькі не прыдумвалі! Напрыклад, Сяргей і Таццяна Варанюк (муж вучыцца ў БДУ, а жонка — выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры і спорту) знялі відэаролік, у якім «памяняліся» сваімі абавязкамі. Уявіце карціну, як студэнт-вайсковец Сяргей прачынаецца і ідзе на кухню, дзе амаль «прафесійна» гатуе суп, а яго сімпатычная жонка апранае форму, развітваецца і хуценька выходзіць за дзверы.

Аляксандр і Ганна Смалоўскія, студэнты Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова, паказалі гледачам ток-шоу «Ці сапраўдная вы сям'я?», дзе мужа і жонку выпрабоўвалі на «дэтэктары хлусні». На пытанне «Ці забяспечыў муж сям'ю жыллём?», Аляксандр упэўнена адказаў «Так!». Зал замер у чаканні вердыкту дэтэктара хлусні, але той пацвердзіў сказанае. Ганна на тое ж пытанне адказала «Не» і... таксама пачула, што гэта праўда. Інтрыгу спыніла відэа, дзе сужэнцы Смалоўскія гуляюць па калідорах інтэрната, у якім жывуць. А там, вядома, і на кухню паспей у час, каб у чарзе да пліты не стаяць, і ў душ хадзі не тады, калі захочацца. Галоўны ў сям'і не муж, і не жонка, а... камендант студэнцкага інтэрната.

Калі на сцэну выйшлі артысткі ў народных строях і пачалі спяваць, многія адчулі сябе на беларускім вяселлі. Гэтак «падманулі» ўсіх Андрэй (студэнт БДУІР) і Алеся (студэнтка БДПУ імя М. Танка) Чайцыны. Яны зрабілі беларускую «візітку», стылізаваную пад заручыны, з танцамі і песнямі. А вось госці з Брэста, Міхаіл і Ірына Ярмалюк, якія вучацца ў Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце, падчас расповеду пра сваю пару раскрылі невялічкую сямейную «таямніцу»: Міхаіл больш за ўсё ў жыцці захапляецца вэбпраграмаваннем і прысвячае гэтаму шмат часу. Але Ірына, як і належыць жонцы, «узброілася» хітрасцю жаночай і кулінарнай. «Адзінае, што можа адцягнуць увагу майго мужа ад камп'ютара, — гэта смачна прыгатаваная піца», — дзеліцца сакрэтам удзельніца конкурсу.

Назіраючы за сем'ямі, якія са сцэны «знаёміліся» з гледачамі, падумалася, што ў наш прагматычны час многія, перш чым ажаніцца ці выйсці замуж, атрымліваюць адукацыю, шукаюць працу з добрым заробкам, набываюць кватэры, машыны, і толькі пасля гэтага задумваюцца пра пошукі спадарожніка жыцця. Рамантычных асоб, што пакахалі адно аднаго яшчэ ў студэнцтве і тады ж узялі шлюб, цяпер не так шмат, але яны ўсё ж ёсць. Па меркаванні галоўных арганізатараў — Міністэрства адукацыі і Цэнтральнага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі, — праводзіць такі конкурс вельмі важна перш за ўсё для таго, каб паспрыяць павышэнню прэстыжу студэнцкай сям'і і адраджэнню традыцый і развіцця сямейных каштоўнасцяў. Студэнты, якія ўступаюць у шлюб, нясуць двайную адказнасць: патрэбна і вучыцца, і сямейныя пытанні вырашаць. Таму мэтанакіраваная работа па ўсебаковай падтрымцы маладых сем'яў як аднаго з галоўных кірункаў дзяржаўнай палітыкі, вельмі важная. Але ж вернемся непасрэдна да спаборніцтваў.

Яшчэ адным этапам конкурсу сталі праекты, якія можна было б ажыццявіць у будучым, «сямейнымі» сіламі. «ОК» — гэта не проста абяцанне таго, што ўсё будзе добра, а яшчэ і назва агенцтва па арганізацыі свят, праект якога прадставілі Вольга і Мікалай Глазко з Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пушкіна. Назву агенцтва расшыфраваць не цяжка. Яна складаецца з першых літар імён сужэнцаў — Коля і Оля, хоць у агенцтве, як расказала сям'я Глазко, акрамя іх, будуць працаваць яшчэ дыджэй, спявачка, дэкаратар, клоун і спецыяліст па фота- і відэаздымцы. А студэнты БДУ Максім і Марына Равенка прадставілі гледачам свой праект «Імідж студэнцкай сям'і ў інфармацыйнай прасторы», паводле якога галоўным аб'яднальным звяном для сям'і мог бы стаць танец.



Мікалай і Вольга Глазко распавядаюць пра свой сямейны праект — агенцтва па арганізацыі свят «ОК».

— Людзі ў шлюбе звязаны не штампам, грашыма і абавязкамі, а задавальненнем ад жыцця, ад таго, што адбываецца зараз, — лічаць Максім і Марына.

Сям'я Смалоўскіх прадставіла праект, прысвечаны аграгурызму ў Магілёўскай вобласці. Для будучай аграсядзібы пад назвай «Сустрэча сябрукоў» Ганна і Аляксандр ўжо нават месца выбралі. Безумоўна, увагі заслугоўвалі і іншыя сямейныя задумкі, але каб расказаць пра іх падрабязна, патрэбна пісаць асобны матэрыял.

Паколькі сем'і — маладыя, успаміны пра знаёмства, рамантычныя сустрэчы і вяселле яшчэ вельмі яркія. Так, Арцём і Ірына Богдан пазнаёміліся ў першы дзень ва ўніверсітэце, на лінейцы. Яны лічаць, што не кожнаму шанцуе знайсці сваё каханне ў такім маладым узросце. Максім і Марына Равенка сустрэлі адно аднаго падчас практыкі ў Валожыне, пасля чаго зразумелі, што хочуць заўжды быць разам. Ганна і Аляксандр Смалоўскія пазнаёміліся на навагодняй вечарыне, а Андрэй і Алеся Чайцыны аказаліся самымі «сучаснымі» закаханымі — пазнаёміліся праз інтэрнэт. Сямейная пара Варанюкоў, перш чым ажаніцца, была знаёма на працягу шасці гадоў, Міхаіл і Ірына Ярмалюк сталі мужам і жонкай, пражыўшы ў «цукерачна-букетным» перыядзе два гады, а Цемашкевіч Вадзім з БДУ і яго жонка Ірына (вучыцца ў БДУІР) сыгралі вяселле ўсяго праз паўгода пасля знаёмства.

Імён пераможцаў усе чакалі з нецярпеннем. Другое месца падзялілі паміж сабой сем'і Варанюк і Чайцыных. Трэцімі сталі Аляксандр і Ганна Смалоўскія. А галоўны прыз — 2 мільёны рублёў і званне лепшай студэнцкай сям'і — павезлі ў Брэст Мікалай і Вольга Глазко. Дарэчы, бацька Мікалая таксама стварыў сям'ю, калі быў студэнтам трэцяга курса. Гэтак жа лёс склаўся і ў старэйшага брата. Як кажуць, усё «ОК»!

Ганна ГАРУСТОВІЧ.
Фота Надзеі БУЖАН.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
27 06 2013 г.

SEX–БАЛЯСЫ

Вядома, не мела рацыі Шапакляк, калі спявала, што добрымі справамі праславіцца нельга. Можна — толькі для гэтага патрэбны час і намаганні. Але не ўсім гэта даспадобы. Некаторыя жадаюць славы адразу і без залішніх клопатаў. І такі просты спосаб апошнім часам няўрымслівымі асобамі быў знойдзены. Больш за тое, ён імкліва набывае папулярнасць. Усяго толькі і трэба, што... распрануцца. Цалкам і ў цэнтры горада. На фотакамеру, з далейшым выкладаннем здымкаў у інтэрнэце. Такім чынам, вітаю вас, і тэма нашых чарговых "Балясаў" — ню на вуліцы. Зараз гэта новы модны трэнд. Плач, Меладзэ, не спявай больш пра натуру вытанчаную, Дастаеўскага і свецкае кола, бо зараз у пашане натура аголеная...

ПА НЕРВУ — АГОЛЕНЫМ ТРЭНДАМ...

«Адзначылася» Казань. Прычым неаднойчы (гэта, дарэчы, пасля скандалу з выпускніцай, якая зладзіла эратычную фотасесію ў цэнтры Набярэжных Чалноў). Напачатку ў сеціва патрапілі здымкі цалкам аголенай дзяўчыны, якая пазіравала на лужку перад казанскім Крамлём. Балазе, на фатаграфіях на заднім плане хаця б людзі не прысутнічалі. Але далей — больш. Чарговая німфа напачатку знялася ў чым маці нарадзіла каля Казанскага федэральнага ўніверсітэта (прычым навокал хапала людзей, якія або нейкім дзіўным чынам не заўважалі, што адбываецца, або рабілі выгляд), а затым «прагулялася» па цэнтральным гарадскім парку, пасля чаго «завітала» да рыбакоў на беразе ракі... Не паспела мусульманская грамадскасць Татарстана (толькі ўявіце, якая для яе гэта ганьба!) звыкнуцца з тым, што адбылося, як новы ўсплёск... На гэты раз чарговая фотасесія ў стылі ню прайшла на фоне парка Тысячагоддзя і ў скверы перад будынкам парламента Татарстана. І хаця ёсць меркаванне, што ўсе гэтыя здымкі рабіліся ў розныя часы (проста па нейкай невядомай прычыне былі «зліты» ў сеціва толькі зараз і амаль адначасова), пра Казань ужо загаварылі як пра своеасаблівую Мекку порнаіндустрыі... Зараз спрабуюць устанавіць імёны мадэляў. Калі атрымаецца даказаць, што згаданыя фотаздымкі адносяцца да парнаграфічных, дзяўчатам можа пагражаць да шасці гадоў пазбаўлення волі, сцвярджаюць актывісты Саюза мусульманак Татарстана. Як пішуць у сеціве, лета ў Казані абяцае быць спякотным...

Што прымушае дзяўчат ісці на такія «подзвігі»? Любоў да «мастацтва»? Эксгібіцыянізм? Праява больш цяжкай хваробы? Заклад? Канкрэтна за гэтымі выпадкамі праглядаюцца грошы. Фатограф, які выступае пасрэднікам ад імя замежнага спецыялізаванага сайта, плаціць мадэлі за гадзіну «працы» ад 100 долараў. Колькі складае поўны ганарар за здымкі — застаецца толькі гадаць. Як сцвярджаюць самі фатографы ў стылі ню, ад ахвотных адбою няма... Грошы ж лёгкія. А патрабуецца ўсяго толькі маладое цела, сімпатычны тварык і ...поўная адсутнасць комплексаў.

Фота Надзеі БУЖАН.

Па шчырасці (ну хіба ж гэта тайна!), як і большасць мужчын, я вельмі паважаю жаночыя прывабнасці. Але як бы рэагаваў на з'яўленне побач з сабой у цэнтры горада аголенай дзяўчыны, сказаць не магу. Ну, не было дагэтуль у нас кодэксу паводзін у такой сітуацыі! Кодэкс будаўніка камунізму быў некалі, а гэтага — не было! Разгубіўся б, напэўна: ці тое «хуткую» выклікаць, ці аўтограф браць, а можа, сфоткацца побач напрасіцца... Адкуль я магу ведаць, што ў той дзяўчыны ў галаве? Таму, думаю, трэба ў гэтай сферы навесці парадак, і ўношу свае прапановы, як той казаў, па ўдасканаленні...

Самае галоўнае — справу нельга пускаць на самацёк, усё павінна быць планава. Трэба, каб аддзелы кадраў на прадпрыемствах і ва ўстановах склалі спісы маладых дзяўчат для абавязковага праходжання фотасесій у стылі ню на фоне архітэктурных славутасцяў гарадоў і мястэчак. Прафкамы таксама не павінны заставацца ўбаку: няхай адказваюць за транспарт, актыўнасць удзельніц. Калі якая работніца Іванова будзе без імпэту ставіцца да здымак, можна і квартальнай прэміі пазбавіць. Або водпуск на зіму перанесці. Па прынцыпе: не хочаш распранацца — будзеш апранацца. Самым актыўным, наадварот, каштоўныя падарункі і іншыя прыемныя бонусы. Уяўляеце гэты малюнак?.. Да плошчы без перапынку пад'язджаюць аўтобусы, у розных яе кутах адны чародкі дзяўчат, распрануўшыся, цярпліва чакаюць сваёй чаргі да прафесійнага фатографа, другія, ужо трохі стомленыя доўгімі здымкамі, але задаволеныя вынікам, няспешна сыходзяць з імправізаванай студыі пад адкрытым небам... У цішыні гучыць голас кіраўніка адной з груп: «Дзяўчаткі, калі ласка, затрымайцеся, дайце магчымасць замежным турыстам зрабіць колькі фатаграфій на памяць пра наведванне нашага горада!». Ідылія... Ці абсурд? А як назваць дзеянні маладзіц? У сваёй кватэры ці ў якім бязлюдным куточку кожны вольны хадзіць так, як пажадае. А ў грамадскім месцы ўсё ж трэба прытрымлівацца нормаў маралі і паводзін цывілізаванага чалавека.

P.S. Пэўна ж, супадзенне... Літаральна ўслед за вышэйапісанымі падзеямі ў Расіі эратычная фотасесія адбылася на цэнтральнай плошчы Гомеля. Дзяўчына-мадэль «прыадкрыла» з-пад лёгкага паліто грудзі. Здымкі доўжыліся літаральна некалькі хвілін раніцай, хаця на задні фон нават у такі час патрапілі людзі. Гэты ж фатограф адносна нядаўна здымаў увечары іншую мадэль у стылі ню ў вагоне мінскага метро. Як асабіста па мне, дык наш прыклад эратычных здымак можна назваць не толькі прыгожым (казаў жа, што люблю жаночыя «прывабнасці»), але нават цнатлівым. Галоўнае, каб далей галаву моцна не напякло. Наперадзе ж — лета...

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«МАЙМУ МУЖЧЫНУ ДАВЯДЗЕЦЦА ПРЫРУЧАЦЬ «САМОТНУЮ ВАЎЧЫЦУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Інтэрнэт дапамагае павысіць «рэйтынг папулярнасці»?

— Калі ўзгадаць, напрыклад, 90-я, то па тэлевізары трансліравалі шмат музычных праграм. І я запісвала песні, якія гучалі ў іх, на відэамагнітафон. А зараз любую кампазіцыю лёгка знойдзеш у інтэрнэце. Альбо пры жаданні любую навіну можна распаўсюдзіць за лічаныя хвіліны. Я лічу, што ён і выступае своеасаблівым «рычагом» папулярнасці артыста. Мае інтэрнэт і адмоўны бок — недарэмна ж яго называюць «вялікай сметніцай». Калі чалавек хоча збегчы ад нейкіх сваіх рэальных праблем, спаганяць сваю злосць і няўдачы на іншых, усё пераносіцца ў віртуальную прастору.

— Ці змянілася з часам стаўленне да крытыкі, якую даводзіцца чуць у свой адрас?

— Калі толькі прыехала ў Мінск і пачала чытаць пра сябе нейкія чуткі, то было жаданне апраўдацца, даказаць, што напісанае — няпраўда. А потым я зразумела, што не бывае дрэннага піяру. Ён проста «чорны» ці «белы» і важна ў любой сітуацыі знаходзіць для сябе нейкія станоўчыя моманты. Я добра стаўлюся да канструктыўнай крытыкі, бо яна дапамагае мне ўбачыць недахопы. Аднак лепшы крытык для мяне — я сама. Таму я спецыяльна прашу, каб некаторыя мае выступленні запісвалі, а потым праглядаю іх і аналізую. Тады я бачу, што і дзе недапрацавана, альбо ў якім кірунку рухацца далей. Безумоўна, ёсць людзі, якім я не падабаюся. Усе мы розныя, і я за тое, каб спакойна рэагаваць на нядобразычлівасць людзей.

— Раскажыце пра новы альбом, які вы запісвалі ў Англіі...

— Над маім новым сольным альбомам праца пачалася яшчэ летась. Калі я выйграла нацыянальны адбор, то над альбомам працавалі паралельна. Запіс яго рабілі ў студыі Abbey Road, у якой запісваліся такія легендарныя рок-гурты, як, напрыклад, The Baetles. Некаторыя кампазіцыі запісалі ў Швецыі. Зараз ужо ўсе матэрыялы гатовы. Засталося толькі выпусціць дыск і прэзентаваць яго.

Лепшы крытык для мяне — я сама. Таму я спецыяльна прашу, каб некаторыя мае выступленні запісвалі, а потым праглядаю іх і аналізую.

— Якім па настроі атрымаўся дыск?

— Альбом будзе пазітыўным, моладзевым і сучасным. Месцамі там прысутнічае выклік, і ён досыць адкрыты. У мяне ёсць адна песня, якая ў перакладзе з французскай мовы называецца «Каханне ўтраіх». Усе кампазіцыі прасякнуты атмасферай Лондана. Я жыла ў Соха — раёне музычнай індустрыі, дзе жывуць і працуюць творчыя людзі. Для іх з'яўляецца прыярытэтам свабода самавыяўлення. Акрамя гэтага, аўтары майго альбома — маладыя людзі, якія якраз і з'яўляюцца прыхільнікамі такога ладу жыцця. Усё гэта знайшло адлюстраванне ў маіх песнях, што, магчыма, будзе пэўнай нечаканасцю для слухачоў.

У сітуацыі з дысквалiфікацыяй на «Еўрафэсце» летась я зусім па-іншаму ўбачыла многіх з майго акружэння. Не па маёй віне ўсё тое адбылося, але ж знайшліся людзі, якія мяне асуджалі. А я іх лічыла блізкімі.

— Каб расці і развівацца ў творчасці, трэба эксперыментаваць. У вас існуюць нейкія рамкі ў гэтым плане?

— Сама прафесія прадугледжвае, што эксперыменты павінны быць. Ёсць артысты, якім удаецца ў адным вобразе ўсю жыццё заставацца папулярнымі. Многія прыкладна кожныя два гады змяняюць свой стыль. Вось Кіркораў з такіх. Ён знаходзіць новыя вобразы і здзіўляе. Я лічу, што змены патрэбны, але многае залежыць ад чалавека, яго стылю выканання і душэўнага складу. На пачатку сваёй кар'еры я шмат эксперыментавала са знешнасцю. Адзіным абмежаваннем была забарона фарбаваць валасы, бо мой натуральны колер сёння ўжо рэдка сустракаецца. Напярэдадні «Еўрабачання» я трапіла ў рукі стыліста Канстанціна Эмануіла. Калі ён сказаў, што будзем абразаць валасы, я не пярэчыла, таму што ўжо была гатова развітацца з касой. Чалавек — прафесіянал, і ён паказаў мяне для іншых з новага боку.

— Эстрада — гэта школа выжывання. Як яна паўплывала на вашы стасункі з навакольнымі?

— Мая школа жыцця пачалася яшчэ падчас працы ў Беларусбанку. Кожны дзень ты выдаеш людзям заработную плату. Яны стаяць у чарзе кожны са сваім характарам і сваімі праблемамі: у адных дзеці, іншыя спазняюцца некуды. І ты іх не хвалюеш. Таму, можна сказаць, да Мінска я была падрыхтавана. Ведала, што не ўсё проста, бо існуюць і інтрыгі, і зайздрасць. Я не маю часу на такога роду заняткі і мне нецікава абмяркоўваць нейкія чуткі ні пра сябе, ні пра іншых. Не буду зараз выдаваць сябе за чалавека, якога ўсе любяць. У сітуацыі з дысквалiфікацыяй на «Еўрафэсце» летась я зусім па-іншаму ўбачыла многіх з майго акружэння. Не па маёй віне ўсё тое адбылося, але ж знайшліся людзі, якія мяне асуджалі. А я іх лічыла блізкімі. Тая сітуацыя стала лакмусавай паперкай, якая паказала, хто ёсць хто. Зараз падтрымліваю з імі выключна працоўныя адносіны.

— Слухаючы вас, складваецца ўражанне, што вы моцны чалавек. А якім павінен быць мужчына побач з такой жанчынай?

— Тут два варыянты: чалавек павінен быць ці мацнейшым за мяне, ці слабейшым. Калі будзе слабейшым, я змагу падзяліцца з ім сваёй сілай і ў нас будзе гармонія. А моц павінна праяўляцца ў тым, што мужчына будзе ў нечым для мяне прыкладам. Ён павінен здзіўляць мяне кожны дзень. Яму давядзецца прыручаць «самотную ваўчыцу».

— Але ж у адносінах з часам праяўляецца не толькі станоўчае, але і адмоўнае...

— Недахопы ёсць у кожнага чалавека. Важна ўмець цярпець і дараваць. Безумоўна, ёсць межы, якія не трэба пераходзіць, аднак варта імкнуцца засяроджвацца на станоўчых рысах характару. Галоўнае — памятаць, што калі ты пакахаў чалавека, то трэба прымаць яго і з недахопамі.

Алена ДРАПКО.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.
Адрас рэдакцыі:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 24.012.
Нумар падпісаны ў 19.30 26.06.2013 г.

■ Прыёмная кампанія

ВА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ЦТ УЖО 45 СТАБАЛЬНЫХ СЕРТЫФІКАТАЎ

Учора сталі вядомыя першыя вынікі цэнтралізаванага тэсціравання 2013 года. Як расказаў журналісту «Звязды» дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў, сярод удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай і рускай мове аказалася 45 стабальных вынікаў: на ЦТ па беларускай мове 100 балаў набралі 6 чалавек, а на ЦТ па рускай мове — 39 чалавек. Праўда, трэба мець на ўвазе, што рускую мову здавалі сёлета на 50 тысяч чалавек больш, чым беларускую.

Нагадаем, што летась да максімальнага выніку ў 100 балаў здолелі дацягнуцца 7 чалавек на ЦТ па беларускай мове і 19 чалавек — на ЦТ па рускай.

Бадай што самай цікавай інфармацыяй для многіх з'яўляецца колькасць абітурыентаў, якія не змаглі пераадолець новы ўстаноўлены мінімальны парог у 10 балаў. Пасля праверкі ведаў па беларускай мове з прыёмнай кампаніі выбылі 5% удзельнікаў ЦТ па гэтай дысцыпліне. А на ЦТ па рускай мове да 10 балаў не дацягнуліся больш як 8% абітурыентаў. Нагадаем, што экзамен па дзяржаўнай мове з'яўляецца абавязковым для ўсіх: і тых, хто паступае на гуманітарныя і лінгвістычныя спецыяльнасці, і тых, хто марыць стаць урачом, інжынерам або дызайнерам. А нуль балаў умудрыліся набраць 4 удзельнікі ЦТ па беларускай і 16 удзельнікаў ЦТ па рускай мове.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Інфарм-укол

НАМ 40, АЛЕ МЫ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ

Пасля 40 гадоў жанчынам могуць пагражаць так званыя ўзроставыя захворванні — павышэнне ціску, гінекалагічныя праблемы, атлусценне, хваробы, звязаныя з разбурэннем і змяненнямі ў храстковай, коснай тканках. Каб папярэдзіць такія змены, неабходна сачыць за сваім харчаваннем, быць уважлівай да самаадчування, праходзіць неабходнае медыцынскае абследаванне, нават калі нічога не непакоіць.

— Пасля 40 гадоў абменныя працэсы ў арганізме жанчыны падвяргаюцца істотным зменам, паколькі зніжаецца колькасць выпрацаваных палавых гармонаў, метабалізм моцна запавольваецца, а таму жанчыны, якія працягваюць харчавацца, як і раней, не могуць падтрымліваць сваю вагу ў норме, — тлумачыць **участковы тэрапеўт 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна СКАРАХОД.** — Змагацца з прыродай цяжка, аднак у нашых сілах зменшыць прыбаўку вагі: неабходна змяніць рэжым і характар харчавання, адмовіцца ад высокакаларыйнай ежы на карысць гародніны, фруктаў, нятлустых мяса і рыбы, зяленіва, імкнуцца не вячэраць пасля 18.00. Неабходна павялічыць расход калорый за кошт фізічных нагрузак. Займайцеся фізкультурай, плаваннем, хадзіце не менш за 2 гадзіны ў дзень. З-за павелічэння сутачнай патрэбы кальцыю, варта ўжываць прадукты, насычаныя мінераламі і вітамінамі: малако і малочныя прадукты (скажам, цвёрдыя сыры, ёгурты), нятлустую рыбу і мяса (у тым ліку кансервы з касцямі), яйкі, фрукты, фасолю, гародніну, арэхі. Калі вы будзеце сачыць за сваім рацыёнам, то пазбегнеце набору лішняй вагі...

Да 40 гадоў ва многіх на рэнтгенаграме назіраюцца прыкметы **астэаартрозу**. Звычайна сімптомы развіваюцца паступова. Першы сімптом — боль, які ўзмацняецца пры фізічнай нагрузцы. У некаторых людзей адзначаецца тугарухавасць суставаў пасля сну — гэта праходзіць літаральна праз паўгадзіны пасля таго, як мы пачалі рухацца. Па меры развіцця захворвання сустаў становіцца менш рухавым, дотык да яго, любы рух становяцца хваравітымі.

Пасля з'яўлення першых сімптомаў астэаартроз часцей за ўсё працягвае павольна прагрэсаваць, выклікаючы парушэнні функцыі. Часам дэгенератыўныя працэсы ў суставах прыпыняюцца.

Каб не сутыкнуцца з падобнай праблемай ужо ў 40 гадоў, неабходна выконваць аздараўленчыя мерапрыемствы:

1. Хадзіць ва ўмераным тэмпе не менш за 20-30 хвілін у дзень.

2. Займацца плаваннем.

3. Ездзіць на веласіпедзе.

4. Хадзіць на лыжах.

5. Разгружаць суставы: не бегаць, не скакаць, не прысядаць і не хадзіць па няроўнай мясцовасці працяглы час; не сядзець і не стаяць падоўгу; умацоўваць мышцы на велатрэнажоры; насіць зручны абутак (з абцасам не вышэй за 2-3 см); насіць эластычныя фіксатары, прымяняць сродкі дадатковай апоры з індывідуальным падборам.

Для прыпынення дэгенератыўных працэсаў неабходна таксама выконваць усё вышэйпералічанае, а таксама ўжываць хондрапратэктары. Такая тэрапія прызначаецца толькі індывідуальна.

Яшчэ адна ўзроставая праблема — **астэапароз**. Гэта найбольш распаўсюджанае захворванне касцей, пры якім зніжэнне масы косці і парушэнне яе структуры прыводзіць да змяншэння трываласці і павелічэння рызыкі пераломаў. Павышэнню рызыкі астэапарозу спрыяюць:

- ✓нізкая вага
- ✓менапаўза да 45 гадоў
- ✓спадчыннасць
- ✓недахват кальцыю і вітаміну Д у ежы
- ✓курэнне
- ✓злоўжыванне алкаголем
- ✓нізкая фізічная актыўнасць.

Важным момантам тут з'яўляецца своечасова распачатая замяшчальная гарманальная тэрапія. Памятайце таксама, што распазнаць захворванне на ранніх стадыях ці нават схільнасць да яго дазваляе такі сучасны метад дыягностыкі, як дэнсітаметрыя.

Не варта таксама забываць пра **артэрыяльную гіпертэнзію**. Калі ў членаў вашай сям'і назіраецца гіпертанія, або вам — за 30, можаце рэгулярна мераць ціск. Адмоўцеся ад курэння, не ўжывайце алкаголь у вялікіх дозах ці не ўжывайце наогул. Не ўжывайце шмат тлустай і салёнай ежы. Рабіце зарадку, памятайце пра карысць язды на веласіпедзе і актыўную хаду. Вучыцеся пераадольваць стрэсавыя сітуацыі. Падтрымлівайце нармальную вагу.

Калі вам паставілі дыягназ артэрыяльнай гіпертэнзіі, гэта азначае, што вам неабходна:

1. Абавязкова прымаць усе прэпараты, якія прызначыў урач.

2. Прымаць лекі ў адзін і той жа час.

3. Ніколі не прапускаць прыём прэпарата з-за таго, што ваш ціск у норме. Варта толькі абмяркоўваць свае назіранні з урачом.

4. Папаўняйце запас лекаў да таго, як яны скончацца.

Святлана БАРЫСЕНКА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Экслібрыс «Звязды»

І НАШ «БЭЎВУЛЬФ»

Бэўвульф / пер. са старажытнаанглійскай мовы Антона Францішка Брыля. — Мінск : Зміцер Колас, 2013. — 130 с.



Калі за акном +32 °С, самы час для эпасу. Можна зняць з паліцы цяжкі том з ісландскімі сагамі, «Нібелунгамі» і «Беавульфам». Зрэшты, у дачыненні да апошняга томік можа быць невялікі і называцца крыху па-іншаму — «Бэўвульф».

У беларусаў з'явіўся свой выдатны пераклад класічнага помніка сусветнай літаратуры, эпічнай паэмы даўніх англасаксаў.

Антон Францішак Брыль (на мой погляд, найлепшы паэт свайго пакалення) зрабіў яго з вялікай любоўю, старанасцю і цярпеннем — больш за шэсць гадоў праседзеў над арыгінальным тэкстам паэмы. Мне лёгка і радасна пісаць гэтыя кампліментарныя радкі, хоць я і парушаю такім чынам сваё правіла залазіць у «нетры» з першага абзаца. Але гэта сапраўды важная падзея для ўсёй беларускай культуры і беларускай мовы. Што можна сказаць пра «Бэўвульфа», пра якога, як і пра «Слова пра паход Ігаравы», гавораць ужо дзвесце гадоў, пішуць манаграфіі дзясяткі даследчыкаў і вычарпалі ў сваіх штудыях ледзь не ўсе коскі і прапушчаныя склады арыгінала? Я толькі магу падзяліцца з чытачамі сваім адчуваннем ад перакладу.

Відавочна, узнавіць мысленне англасаксаў VIII стагоддзя праз сучасную беларускую лексіку даволі складана. Перакладчыку даводзілася выбудоўваць баланс паміж архаікай і ўласна паэзіяй. На маю думку, атрымалася гэта ў яго выдатна. «Бэўвульф» надзвычай добра дысцыплінуе перакладчыка: алітэраваны верш паэмы прадугледжвае разбіўку радка на два паўрадкі, прычым зычныя гукі ў пачатковых складах націскных стоп мусяць перагукацца з паўрадка ў паўрадок, такім чынам перакідваючы масток праз цэзуру і ўтвараючы своеасаблівую «рыфму» ў нерыфмаваным творы. Бадай, для перакладчыкаў, якія часам любяць крыху «разгуляцца» і «пахуліганіць», гэта амаль Берлінскі мур з вертухаямі на вежах.

Дзе ўжо тут разгуляешся, калі даводзіцца суадносіць нават пачатковыя склады перакладзеных слоў! А яшчэ ж можна ўспомніць пра даўжыню радка, пра неабходныя каментарыі да цьмяных месцаў паэмы. Усё гэта перакладчык, які праштудзіраваў падчас працы англамоўныя спецыяльныя даследаванні, прысвечаныя «Бэўвульфу», падае ў каментарыях і прадмове. Ёсць у кнізе і адсылкі да спецыяльнай літаратуры, індэкс эпізодаў і ўстаўных аповедаў у «Бэўвульфе», схемы-радаводы даўніх уладароў, якія згадваюцца ў паэме. Як прыклад алітэравананага верша, дададзена напрыканцы «Песня пра Гільдэбранда», перакладзеная А.Ф. Брылём са стараверхненямецкай мовы.

Такім чынам, можна гаварыць пра першае акадэмічнае выданне сусветнага эпасу, якое выйшла па-беларуску. Па маштабе і складанасці задачы сёння яго можна параўнаць хіба з перакладам гётэўскага «Фаўста» Васіля Сёмухі, які, зрэшты, прызнаваўся, што ўзнавіць арыгінальны «кнітэльвэрс» яму не ўдалося. Вельмі нават верагодна, што сёе-тое не ўдалося перадаць і Антону Брылю, але што менавіта — пра гэта можа з пэўнасцю гаварыць толькі той, хто ведае старажытнаанглійскую мову. Што да лексікі перакладу, то ў нашым «Бэўвульфе» ёсць нямала старабеларускіх слоў, якія неапраўдана доўга пыліліся на старонках «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы». У той жа час архізмы не перашкаджаюць успрыняццю паэмы. Безумоўна, усе яны спецыяльна агавораны і патлумачаны.

Увогуле дзіўна тасуецца калода, як казаў булгакаўскі персанаж. «Бэўвульф» — паэма, якая захавалася ў адзіным спісе XI стагоддзя (гэта значыць, пасля яе стварэння прайшло ўжо тры стагоддзі — чые вершы сёння можна з такой любоўю перапісваць, каб яны захаваліся яшчэ трыста гадоў?), пасля гэты адзіны спіс нейкім дзівам ацалеў пасля пажару ў бібліятэцы Роберта Колтана ў 1731 годзе. Можа, таму і аддалі яе ў добрыя рукі філолага Торкеліна ў 1786 г., які трыццаць гадоў атрымліваў зарплату толькі за тое, што даследаваў добратакі патрапаны за семсот гадоў адзіны экзэмпляр паэмы, і ў 1815 г. нарэшце апублікаваў яе. Мне гэта нагадвае гісторыю з рукапісным архівам Максіма Багдановіча, які Адам Ягоравіч склаў у куфар і паставіў у сутарэнні свайго дома. У час грамадзянскай вайны дом быў спалены, а куфар з рукапісамі Багдановіча ацалеў, бо трапіў у ваду. Гэтыя размытыя вадой старонкі і былі праз некалькі гадоў перавезены ў Мінск і апублікаваны.

